Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь
ארבעטער פון אלע לענדער, פאַרייניקט זיך

САВЕЦКАЯ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

2 ЧЭРВЕНЯ 1932 г.
№ 121 (3500)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 7-09
Адказн. сакратара 4-79
Сэкратароў . . . 6-11
Начная рэдакцыя (ніна заапіка) 12-83
Выдавецтва . . . 3-4

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . 1 руб
3 . . . . 3 .
6 . . . . 6 .
Падпіска прымаецца ўсімі аддзяленнямі сувязі на месцах і дастаўчыкамі.
Рукапісы не звяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛ. ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ
1 радка нонпарэль 1 руб

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
аб зрубе 1 дакумэнту—2р.

Москва, Кремль, Правительств. библ-ка СССР и РСФСР. янв-дек 1932 г.

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ, ПЕРАДАВЫ: Усебеларускаму зьлёту дэпутацкіх груп—баль шавіцкую сустрэчу. С. К. Увага лягер наму пэрыяду РСЧА (4 стар.).

Брыгада Старавойтава паказвае, як трэба змагацца за тэмпы і якасьць сяўбы.

Навукова-дасьледчая работа БССР у 2-й пяцігодцы (даклад прэзыдэнта БАН т. ГОРЬІНА на Ўсебеларускай канфэрэнцыі па выпрацоўцы пляну навукова-дасьледчай работы ў другой пяцігодцы (2 стар.).

Шырэй тартыйна-масавую работу ва кол пастаноў ЦК і СНК (3 стар.).

Зьлёт дэпутацкіх груп мэталяпрамысловасьці. Заводы на ўдарнаму рых туюцца да зьлёту (3 стар.).

Пра мерапрыемствы па арганізацыі пашыўкі вопраткі і абутку ў парадку індывідуальных заказаў. Пастанова СНК БССР (3 стар.)

Шырэй фронт тэхнічкай прапаганды на транспарце. Гутарка з брыгадзірам сталінскай эстафэты на транспарце праф. Мануйлавым (3 стар).

Шырэй разгарнуць калгасны тандаль Пастанова Наркамзему СССР і Калгас цэнтру СССР (4 стар.).

Арганізацыя працы на калгасных малочных таварных фэрмах і фэрмах вырасьліваньня маладняка па БССР. Пастанова Белкалгасцэнтру. (4 стар.)

Усебеларускаму зьлёту дэпутацкіх груп--баль шавіцкую сустрэчу

Савецкая чорная мэталюргія пасьпяхова ідзе ад перамогі да перамогі. За дача, пастаўленая XVII партыйнай канфэрэнцыяй у 1932 годзе—даць 9 млн. тон чыгуна і дадаткова мільён па сустрэчным, цалкам магчыма для выканьня. Аб гэтым красамоўна сьведчаць факты пуску ў эксплёатацыю другой па магутнасьці домны № 7 на заводзе імя Дзяржынскага, перавыкананьне плянавых заданьняў Кузьнецкай домны (102 проц.) і давядзеньне сутачнай выплаўкі чыгуну да рэкорднай лічбы 19.256 тон—лічбы яшчэ небачанае да гэтага часу.

Аднак і гэтага мала. Нават такія высокія тэмпы разьвіцьця чорнай мэталюргіі не забясьпечваюць поўнасьцю выкананьня індустрыяльнай праграмы СССР. На прамысловасьці недаатрымана за першыя чатыры месяцы 1932 году сотні тысяч тон мэталю.

XVII партыйная канфэрэнцыя ў сваім рашэньні чотка запісала «цэнтральнай задачай усяго народна-гаспадарчага пляну на 1932 год зьяўляецца выкананьне вытворчай і будаўнічай праграмы па чорнай мэталюргіі, вугалю і машынабудаўніцтве: 1. У сувязі з гэтым першай карэннай задачай прамысловага пляну зьяўляецца бязумоўнае перамаганьне адставаньня чорнай мэталюргіі, давядзеньне выпуску вырабу чугуну ў 1932 годзе да 9 млн. тон, сталі да 9,5 млн. тон, пракату да 6,7 млн. тон, выплаўкі якасных сталяй да 676.000 тон.

Дырэктыва гэта пакуль што застаецца на выкананай.

Вытворчасьць мэталю ў сваю чаргу патрабуе вытворчасьці адпаведнага аб сталяваньня. Між, тым, выкананьне заказаў на абсталяваньне для мэталюргіі радам заводаў-пастаўшчыкоў праходзіць вельмі марудна. Шмат якія аб'ялнаньні і заводы праяўляюць недапушчальныя адносіны да заказаў і гэтым самым яўна недаацэньваюць гаспадарча-палітычнай важнасьці выкананьня пляну будаўніцтва па чорнай мэталюргіі.

Вось чаму ўся краіна павінна змагацца за яшчэ больш высокія тэмпы разьвіцьця чорнай мэталюргіі, за поўнае выкананьне заказаў для яе.

На мільёны рублёў разьмешчана на мэталязаводах БССР заказы для чорнай мэталюргіі, для Кузьнецкбулу, Дняпрабуду і інш. волатаў сацыялістычнага будаўніцтва. Барацьба за выкананьне гэтых заказаў непасрэдная задача мэталязаводаў БССР.

ЧОРНАЙ МЭТАЛЮРГІІ І Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ ПАВІННЫ БЫЦЬ АДГРУЖАНЫ ЗАКАЗЫ НА АБСТАЛЯВАНЬНЕ.

10-га чэрвеня адкрываецца Ўсебеларускі зьлёт дэпутацкіх груп 23 мэталязаводаў разам з партыйнымі і прафэсіянальнымі арганізацыямі.

На парадку дня зьлёту пытаньне аб выкананьні заказаў для чорнай мэталюргіі. Дэпутацкія групы раскажуць, больш верна, дадуць справаздачу аб тым, што яны зрабілі для выкананьня сваіх абавязацельстваў перад чорнай мэталюргіяй. Дэпутацкія групы скажуць як іх завод, яны самі мабілізавалі шырокія рабочыя масы на выкананьне дырэктыў XVII партыйнай канфэрэнцыі.

У такой-жа ступені як і выкананьне заказаў для чорнай мэталюргіі стаіць пытаньне аб рабоце гэтых заводаў у барацьбе за тэхніка-эканамічную незалежнасьць СССР, за сталінскае авалоданьне тэхнікай.

«Аднак, зьлёт дасьць належны эфэкт толькі ў тым выпадку, калі ён будзе праведзены як зьлёт паказу. Кожная дэпутацкая група мэталязаводу павінна прадэманстраваць перад зьлётам вопыт канкрэтнай работы ў якой небудзь галіне» (ЧАРВЯКОЎ). Іменна ў гэтым і заключаецца работа зьлёту.

На зьлёце дэпутацкія групы абмяняюцца вопытам сваёй работы, на зьлёце будуць выяўлены ўсе прычыны не выкананьня абавязацельстваў узятых тым або іншым заводам. І наадварот: на зьлёце трэба паказаць лепшыя прыклады барацьбы тых мэталязаводаў, якія па сваёй рабоце стаяць у першых радох ударных прадпрыемстваў, так, каб гэты вопыт стаў вопытам для адстаючых.

Зьлёт дэпутацкіх груп 23 мэталязаводаў набывае вялікае палітычнае значэньне ня толькі таму, што гэты зьлёт дэпутацкіх груп вядучай галіны прамысловасьці, што на абвестцы дню актуальнейшыя пытаньні рабочых мэталязаводу, а яшчэ таму, што гэта ад на з новых форм масавай работы, адна з форм мацнейшай сувязі партыі з масамі.

На зьлёт запрошаны дэпутацкая група Маскоўскага заводу «Дынамо»—іншы цытата паходу дэпутацкіх груп за тэхніка-эканамічную незалежнасьць СССР. Дынамаўцы раскажуць аб вопыце сваёй работы, а таксама будуць патрабаваць справаздачы ад дэпутатаў тых мэталязаводаў БССР, якія адгукнуліся на заклік дынамаўцаў і ўключыліся ў гэты паход.

Наш адказ дынамаўцам—рапарт перамог на гэтым важнейшым вучастку. Наш адказ дынамаўцам —гэта ўдарнае выкананьне прамфінпляну, барацьба за тэхніка - эканамічную незалежнасьць. Наш адказ дынамаўцам—гэта няўхільнае выкананьне 6 гістарычных умоў тав. Сталіна.

Шырокая работа падрыхтоўкі да зьлёту разгарнулася на мэталязаводах БССР. У баявую падрыхтоўку ўключыліся ўсе перадавыя мэталяпрацоўчыя заводы БССР: завод імя Варашылава—ініцыятар зьлёту, завод «Камунар», «Пралетары», «Чырвоны Мэталіст», «Камінтэрн», Гомсельмаш і інш.

Дэпутацкая група заводу імя Варашылава на сваім прадпрыемстве разгарнула шырокую падрыхтоўчую работу. Дэпутацкая група ўзяла шэфства над работай па рацыяналізацыі, дабіўшыся правядзеньня ў жыцьцё раду каштоўных рабочых прапаноў.

Дэпутацкая група заводу Гомсельмаш пад кіраўніцтвам сваёй партыйнай арганізацыі за час падрыхтоўкі да зьлёту ўзрасла з 20 чалавек да 120. Дэпутацкая група заводу «Чырвоны Мэталіст» адна з першых адгукнулася на заклік варашылаўцаў, разгарнула шырокую падрыхтоўчую работу, выклікаўшы на сацпасарніцтва дэпутацкія групы заводу Камінтэрн, голхазую фэрму. За час падрыхтоўкі да зьлёту завод «Чырвоны Мэталіст» узьняў уверх крывую выкананьня прамфінпляну, лік відаваўшы прарыў у прамфінпляне за 20 дзён мая.

9 дзён засталося да зьлёту. Гэтыя 9 дзён павінны быць скарыстаны для яшчэ большай падрыхтоўкі да зьлёту Па прыкладзе раённай газэты «Віцебскі пралетары», якая разгарнула на сваіх старонках агляд гатоўнасьці да зьлёту, раённы і нізавы друк павінен прывесьці дэпутацкія групы да зьлёту падрыхтаванымі.

9 дзён да зьлёту—гэта дні масавага агляду работы дэпутацкіх груп. Першаму Усебеларускаму зьлёту дэпутацкіх груп мэталяпрамысловасьці БССР—першаму ня толькі па БССР, але і ў СССР—бальшавіцкую сустрэчу.

Брыгада Старавойтава паказвае
як трэба змагацца за тэмпы і якасьць сяўбы

Вучэцеся працаваць ад брыгады Старавойтава

Невялікая зусім брыгада № 1 на чале з брыгадзірам т. СТАРАВОЙТАВЫМ калгасу «ЧЫРВОНАЯ РУДНЯ», Жлобінскага раёну. У ёй 23 мужчыны і 24 жанчыны. І гэта невялічкая, але моцная, згуртаваная вытворчая адзінка змагаецца за ажыцьцяўленьне вялікай праграмы сяўбы па плошчы ў 266,5 га.

Ведае добра сваё вытворчае заданьне брыгадзір СТАРАВОЙТАЎ. Заўсёды з ім маленькая беленькая кніжачка з надпісам «Гадовае вытворчае заданьне сталай брыгады № 1» Ён яшчэ і яшчэ раз пераглядае сьпісаныя артыкулы кніжачкі, правярае тэрміны, месцы сяўбы, заданьні па ўраджайнасьці, вызначаны за ўсю работу лік працадзён і г. д.

Новую сваю ролю ў калгаснай вытворчасьці—ролю камандзіра—першыя дні т. СТАРАВОЙТАЎ успрыймаў з вялікімі труднасьцямі, а зараз ён ўжо сапраўды камандзір маленькага, але моцнага атраду барацьбітоў за тэмпы, за якасьць работы на палёх трэцяй бальшавіцкай.

І кожны баец гэтага атраду вывучыў сваё заданьне па ўсіх паказьніках работы.

Брыгада мае свой двор, сваю стайню, свой сьвіран для хаваньня зброі. Цягавая сіла і інвэнтар атрыманы па акце ад праўленьня калгасу і размер каваны ўнутры брыгады паміж калгасьнікамі. Зьлейшы вораг гаспадаркі—абязьлічка поўнасьцю разьбіта. Калгасьнік нікому не дазволіць працаваць на сваім кані, карыстацца прымацаваньнем яго збруяй. Без дазволу брыгадзіра ніхто не атрымае каня. Начныя вартаўнікі прынялі па вопісу ўсіх коняй ад брыгады. Па гэтым вопісу кожную раніцу правяраецца наяўнасьць коняй.

58 гадовы, стары—калгасьнік КАПУСЬЦІН, Якім можа гаварыцца сваёй паркай коняй. КАПУСЬЦІН ня толькі лепшы ўдарнік па рабоце, па выхадзе на работу без прагулаў, КАПУСЬЦІН—ударнік і па доглядзе за сваімі коньмі, якіх адразу можна адрозьніць ад усіх іншых. Ён кожны дзень чысьціць сваіх коняй, сам даглядае за іх кармленьнем.

***

Сяўба ў брыгадзе № 1 пачалася пазьней, чым у астатніх брыгадах (нізкія землі). Але, не чакаючы пакуль зямля падсохне, брыгада № 1 усе сілы кінула на дапамогу брыгадзе № 2, дзе былі больш спрыяючыя ўмовы для сяўбы.

Выхад на работу членаў брыгады—добры. Кожны дзень брыгада перавыконвае вызначаныя нормы выпрацоўці. Пры норме баранаваньня ў 1,5 га 3 мая тры чалавекі забаранавалі 5 га, 5 мая 2 чал.—4,99 га, 6 мая 3 чал.—6,03 га. Пры норме па ворыве ў 0,5 га 3 мая 3 чал. узаралі 1,8 га, 4 мая 7 чал.—4,34 га, 5 мая 10 чал.—5,55 га.

Пры норме па разьбіваньні гною ў 25 вазоў 3 мая 5 калгасьніц, разьбілі 150 вазоў, 4 мая 2 чал.—60 вазоў, 6 мая 5 чал.—150 вазоў і г. д.

УДАРНАЙ РАБОТАЙ, БРЫГАДА ПАКРЫВАЕ НЕДАХВАТ РАБОЧАЙ СІЛЫ.

Штодзённы ўлік працы стаў сыстэмай ў брыгадзе Старавойтава. Праўленьне калгасу кожны вечар атрымлівае ад брыгадзіра зялёненькі лісток—«ШТОДЗЁННАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ БРЫГАДЗІРА», дзе ён паказвае колькасьць і якасьць выкананай работы.

Калгасьнікі паставілі сваёй задачай барацьбу за добрую якасьць работы. Таму брыгада робіць выключна радкавы пасеў ачышчаным і пратручаным насеньнем. На вучастку брыгады скарыстана 60 цнт. супэрфасфату. Гэтымі і іншымі агратэхнічнымі мерапрыемствамі будзе забясьпечана выкананьне заданьня па павышэньні ўраджайнасьці.

Так змагаецца брыгада СТАРАВОЙТАВА за тэмпы, за якасьць работы на сацыялістычных палёх.

ЗАКРЭЎСКІ.



Жерабец—вытворнік, арлоўскі рысак «БАЯН» саўгасу імя Леніна, Смалявіцкага раёну.

Узор бальшавіцкай барацьбы за тэмпы і якасьць пасеўнай

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). 25 мая калгас «Ідэал», Ветрынскага сельсавету, перавыканаў плян сяўбы. Засеяна аўса 55 га замест 48 га, ячменю—30 га замест 28 га, на некалькі га. перавышан плян па сяўбе гароху і вікі.

У адказ на пастановы ЦК і СНК калгасьнікі з посьпехам выканалі плян сяўбы і высунулі сустрэчны плян у 30 га кармовых траў і 10 га аўса, які выкананы 27 мая. Калгас «Ідэал» уключыўся ва Ўсебеларускі конкурс на лепшае і хутчэйшае правядзеньне сяўбы. У пашдзёнку штурму калгасьнікі аба вязаліся ня толькі самім правесьці сяўбу, але і дапамагчы адстаючым. Гэты абавязак выкананы. Скончыўшы сяўбу, калгас пераключыўся ўсёмі брыгадамі на дапамогу адстаючым—калгасу—«ПЕРАМОГА» і «СВАБОДА».

Сакрэт пераможнай работы калгасу «Ідэал» хаваецца ў правільнай арганізацыі працы, у давядзеньні да кожнага калгасьніка апошніх пастаноў партыі і ўраду, якія і зьявіліся магутным сродкам у справе пасьпяховага скончэньня сяўбы і ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасу.

27 мая калгас «Свабода» з дапамогаю буксірных брыгад скончыў сяўбу. Старшыням і брыгадзірам гэтых калгасаў Полацкім райкалгассаюзам выдана грашовая прэмія па 75 руб. кожнаму.

Я. ЗОРНЫ.

Перадавікі трэцяй бальшавіцкай

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА. (Па тэлеграфе). Раён скончыў сяўбу яравых культур.

ВУШАЧЫ. (Маланка). Датэрмінова скончыў сяўбу яравых культур калгас «НОВЫ ШЛЯХ», Сіроцінскага сельсавету, Вушацкага раёну, на плошчы 585 га. Калгас «Новы Шлях» аказаў дапамогу 70 працаднямі двум суседнім калгасам. Лепшыя ўдарнікі сяўбы прэм'яваны.

Сакратар партячэйкі КАБЯК.
Старшыня калгасу ТЫЧЫНА.

***

ЦЕРАХАЎКА. (Па тэлеграфе). Калгас «Абарона», дзякуючы правільнай арганізацыі працы і расстаноўчы сіл, пад кіраўніцтвам партарганізацыі 26 мая поўнасьцю закончыў сяўбу. Па асобных культурах плян сяўбы перавыкананы. Бульбы засеяна 62 га, замест вызначаных плянам 61 га, ячменю—44, замест 14 га, аўса—28 га, замест 18 га, лёну—12 га, замест 11 га, вікі—11 га, замест 10. Сяўба працягваецца.

Пастановай раённай конкурснай камісіі калгас вылучаны на прэм'яваньне.

Скончылі сяўбу таксама калгасы «Цяскі», імя Варашылава, імя Молатава.

РК КП(б)Б СУРБА.
Райвыканком ДУПАНАЎ.

***

На падставе шырокага растлумачэньня апошніх рашэньняў партыі і ўраду, мабілізацыі калгасных мас і актыву Петрынскай МТС, Полацкага раёну, шырока разгарнула масавую сяўбу. 27 мая скончылі сяўбу наступныя калгасы: «Ідэал», «Чырвоны Молат», камуна імя №-скай дывізіі, імя Вароўскага, імя Якаўлева, «Правда», «Пахар», «Маяк», імя Сталіна.

Мабілізаваны ўсе сілы раёну на хутчэйшае скончэньне сяўбы.

Дабіваемся зьняцьця раёну з чорнай дошкі.

РК КП(б)Б ПЫЖЫКАЎ
РВК МАТУСЭВІЧ.

***

ЗАСЛАЎЛЬ. (Па тэлеф. ад наш. кар.). Першым у ЗАСЛАЎСКІМ раёне скончыў сяўбу 29 мая калгас «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА», Шаршунскага сельсавету. Плян сяўбы выкананы на 106,9 проц. Калгас пераключыўся на дапамогу па скончэньні сяўбы калгасу «РАСЬСВЕТ» і ўзяў на грамадзкі буксір іншыя калгасы.

30 мая скончыў сяўбу калгас «ЧЫРВОНЫ БАЕЦ», Новадворскага сельсавету, выканаўшы плян сяўбы на 100 проц.

31 мая закончыў сяўбу калгас «ПЯЦІГОДКА», Пуцянскага сельсавету.

ДЗЯМЕШЧАНКА.

***

ВОРША. (Па тэлеграфе ад наш. кар.) Растуць рады перадавікоў у бальшавіцкай—кандыдатаў на пяршынства ва Ўсебеларускім конкурсе на лепшае правядзеньне веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі.

26 мая скончыў сяўбу калгас імя ЛЕНІНА.

Калгас імя ЛЕНІНА ўзяў на грамадзкі буксір адстаючы калгас «ЛАРЫНАЎКУ. Туды накіравана буксірная брыгада калгасьнікаў—ударнікаў з ня гавай сілай і інвэнтаром для дапамогі ў скончэньні сяўбы.

МІЛАШЭЎСКІ.

Мястэчка Жыткавічы--у перадавых радох барацьбітоў за фінплян

МЕНСК. ЦК КП(б)Б—ГІКАЛА, СНК—ГАЛАДЗЕДУ і НКФ—ХАЦКЕВІЧУ.

Жыткавіцкі местачковы савет пад кіраўніцтвам РК КП(б)Б і непасрэдным кіраўніцтвам местачковай ячэйкі КП(б)Б выканаў плян мабілізацыі сродкаў першага кварталу—66 тысяч руб., або на 145 проц. і плян другога кварталу на 20 мая 32 г.—53.165 руб., або 114 проц.

Абяцаем у далейшым выконваць фінплян датэрмінова.

Сакратар партячэйкі КАСЬЦЮЧЭНКА.
Старшыня местачковага савету БЯРТОШ.

ЗА ГРАНІЦАЙ

Парыскія правакатары ня сунімаюцца

ПАРЫЖ. 31-5. Сьледзтва па справе Гаргулова зноў спрабуе зьвярнуцца да першай «версіі» аб Гаргулове, як аб бальшавіку. Пасьля правалаў пакаваньняў белагвардзейскіх сьведкаў накшталт **Астахава**, і іншых «сьведак», французкая паліцыя і сьледчыя ўлады, ня маючы, як відаць, пакуль новых «сьведак», спэцыяльна выклікалі ў **Парыж казака Лазарава** для вочнай стаўкі з Гаргуловым.

Казак Лазараў, які пражывае ў Тарбэ, паведаміў 15 мая ў лісту данскому атаману **генэралу Багаеўскаму**, што «па фатаграфіях Гаргулова, апублікаваных у французкіх газэтах ён пазнаў чакіста з Растова». Сьледаваець **Фужэры** камандыраваў тады ў Тарбэ паліцэйскага інспэктара Мема, які паказаў Лазараву 10 фатаграфій Гаргулова. Пасьля гэтага Фужэры выклікаў Лазарава ў Парыж. Лазараў заявіў сьледчаму, што «камісар Мем не зразумеў яго, інакш ён даведаў бы яму, што ён ведае Гаргулова».

Гаргулоў, выслухаўшы заяву Лазарава, усклікнуў: «ён п'яны, ён алкаголік і слабавумны выродак! Я забіў Думэра, каб прымусіць Ліпу нацыі і ўсе вялікія дзяржавы, Францыю і Амэрыку, змагацца супроць рускага камунізму».

Партызанская вайна ў Манчжурыі

ТОКІЁ. 30-V. Агенство «Сімбун Рэн га» паведамляе з Харбіну, што штаб дывізіі **Мацукі** пераведзены ў **Суйхуэ** (пункт на Хухайскай чыгунцы на поўнач ад Харбіна), для кіраўніцтва карнай экспэдыцыяй супроць антыманчжурская войска ў раёне **Хайлуна**.

30 мая японскія самалёты бамбардыравалі Хайлун. У рэзультаце бамбардыроўкі **горад ахоплены пажарамі.** Паводле слоў агенцтва другая японская экспэдыцыя 29-га мая заняла **Чжаогун** (70 міль на Захад ад Харбіна). Партызанскія атрады **Лі-Хай-Цзіна** адступілі на паўднёвы захад.

Тав. Фостэр--чырвоны кандыдату прэзыдэнты ПАЗШ

НЬЮ-ЁРК. 29-5. Скліканы ў Чыкаго кампартыяй ПАЗШ нацыянальны зьезд аднагалосна пастанавіў высунуць на прэзыдэнцкіх выбарах кандыдатуры **Фостэра ў прэзыдэнты і Джэймса Форда**—негрыцянскага рабочага з штату Алабамі—у **віцэ-прэзыдэнты**. На гэтым, буйнейшым за час існаваньня амэрыканскай кампартыі, зьезьдзе пры сутнічала больш **1200 дэлегатаў ад 47 штатаў**. Пераважная частка дэлегатаў—рабочыя і фэрмэры. 25 проц. дэлегатаў негрыцянскія рабочыя. Толькі 25 проц.—члены кампартыі. У гэнаро вы прэзыдыум былі абраны **тт. Сталін, Тэльман, Сенкатаяма, Муні** і інш.

У прамове, сказанай па даручэньні ЦК кампартыі ПАЗШ **тав. Фостэр** заявіў:—што капіталізм шукае выхаду з крызісу шляхам прадстаўленьня непарэднай дапамогі банкам і карпарацыям, асуджваючы працоўныя масы на паўгалоднае існаваньне і шляхам імпэрыялістычнай вайны. У штаце Кентукі паліцыя затрымала і зьбіла 15 дэлегатаў, з якіх толькі 3 удалося прыбыць на зьезд. Была затрымана таксама дэлегацыя ў акрузе Касэтая і горадзе **Джонтаўне** (штат Пэнсільванія). Дэлегатаў арыштавалі. Зьезд зацьвердзіў выбарчую плятформу.

Увечары адбыўся мітынг. Удзельнічала больш 15 тысяч чалавек. Пасьля мітынгу тысячы рабочых наладзілі паход з чырвонымі сьцягамі і сьпяванем рэвалюцыйных сьпеваў. У прамове, сказанай наконт вылучэньня яго кандыдатуры, тав. **Фостэр** падкрэсьліў непасрэдную небясьпеку імпэрыялістычнага наступленьня і заклікаў масы ўзмацніць барацьбу за абарону СССР.

Баі беспрацоўных з паліцыяй у Польшчы

ВАРШАВА. 1-6. Паведамленьні аб буйных сутычках у Польшчы паміж беспрацоўнымі і паліцыяй прыходзяць з розных месц. У Нова-Радамску маса беспрацоўных сабралася ўчора перад будынкам павятовага праўленьня, патрабуючы выплаты дапамогі і прадстаўленьня работы. Дэманстранты спрабавалі прайсьці ў памяшканьне ўправы. Паліцэйскі атрад разагнаў дэманстрантаў, выверскі зьбіваючы іх.

Газэта «Полёнія» паведамляе, што ўчора адбылася буйная сутычка паміж беспрацоўнымі і паліцыяй у **Катовіцах** (Верхняя Сілезія). Беспрацоўныя гарнямі патрабавалі ад гарадзкой управы выдачы дапамогі. У адказ на гэтае патрабаваньне ўправа выклікала паліцыю, якая пачала разганяць беспрацоўных ружэйнымі прыкладамі. Ся род зьбітых шмат жанчын і дзяцей. (ТАСС).



ЯК ПРАВОДЗІЦЬ СВОЙ АДПАЧЫНАК ГЭРМАНСКАЯ ПРАЛЕТАРСКАЯ МОЛАДЗЬ. НА ЗДЫМКУ. НА ЛОДКАХ.

Рэвалюцыйны рух у Гішпаніі

ПАРЫЖ. 31-V. Паводле паведамленьня **«Юманітэ»** ў **Сэвільі абвешчана на ўсеагульная забастоўка** ў знак пратэсту супроць учыненых паліцыяй, у часе апошніх вулічных сутычак, забойстваў рабочых. У горадзе абвешчаны стан аблогі і прыбылі новыя войнскія часьці. Усё жыцьцё ў горадзе паралізавана. У **Буноль** (правінцыя Валенсія) батракі і беднякі—сяляне арганізавалі вялікую дэманстрацыю, захапілі ў свае рукі тэлеграфную і тэлефонную лінію. У многіх вёсках адбыліся крывавыя сутычкі з паліцыяй. У **Алвэсірэ** абвешчана ўсеагульная забастоўка. У правінцыі **Сэвільі** батракі ў многіх вёсках абвясьцілі забастоўку і разбурылі многа с-г. машын.

ПАРЫЖ. 31-V. Згодна паведамленьняў агенцтва **Гавас** забастоўка рабочых электратэхнічнай прамысловасьці ў **Валенсіі** пашыраецца. **Забастоўшчыкі ўзарвалі 18 розных установак электрычнай сеткі**, чым пакінулі без асьвятленьня некалькі раёнаў.

У **Цэйтэ**, з прычыны генэральнай забастоўкі абвешчанай анархасынды калісцкай канфэдэрацыяй працы, ўлада пастанавіла закрыць прафсаюзы. Адбыўся рад сутычак бастуючых рабочых з паліцыяй.

Барыкадныя баі ў Германіі

БЭРЛІН. 31-V. Бурныя выступленьні галадаючых беспрацоўных у раёне **Вупэрталю** (Зах. Германія) працягваюцца. 3-га дня ў **Эльбэрдфэльдэ** адбыліся новыя дэманстрацыі і сутычкі з паліцыяй. **Беспрацоўныя**, **баронячыся** ад паліцыі, **пабудавалі барыкады**. У Эльбэрдэльдэ фактычна **ўстаноўлены стан аблогі**. Адбываюцца павальныя вобыскі дамоў і прахожых. Учора ў **Гамбургу**, галодныя на тоўпы беспрацоўных **арганізаваным парадкам канфіскавалі тавары ў магазынах**, спынялі на вуліцах грузавікі з мясам, разьмяркоўвалі мяса сярод беспрацоўных.

Бэрлін. 1-VI. Галодныя дэманстрацыі беспрацоўных працягваліся ўчора ў **Рэйнскай** вобласьці і ў **Вэстфаліі**. У **Дуізбургу** беспрацоўныя спрабавалі пранікнуць у прадуктовыя магазыны. Пры гэтым 70 гадовы рабочы застрэлены паліцыяй. У **Вупэртале** рабочыя 4-х будаўнічых прадпрыемстваў абвесьцілі палітычную забастоўку ў адзнаку пратэсту супроць паліцэйскіх зьверстваў. Забаставаўшыя рабочыя з рэвалюцыйнымі сьпевамі дэманстравалі па вуліцах **горада**. У Паўночна - германскай Прыморскай вобласьці ў часе паходу беспрацоўных разгромлены рад магазынаў.

Яшчэ 3 млн. руб. на дзіцячае харчаваньне

МАСКВА 1-VI. (ТАСС). Прэзыдыум Цэнтрасаюзу, надаючы выключнае значэньне дзіцячаму харчаваньню, у адзначэньне дзесяцігодзьдзя піянэрарганізацыі пастанавіў поўнасьцю забясьпечыць да 1 жніўня г. г. гарачым сьнеданьнем вучняў важнейшых прамысловых цэнтраў і новабудоўляў.

Улічваючы шырокую магчымасьць разьвядзеньня пры школах трусоў і сьвіней, Цэнтрасаюз знайшоў магчымым паставіць, на адкорм ва ўсіх школах Саюзу 20 тысяч трусоў, 10 тыс. сьвіней.

З мэтай максімальнага ахопу Харчаваньнем дзяцей у прамысловых раёнах СССР да 1 жніўня ў БССР да гэтага часу павінна быць адкрыта 13 сталовых. Дадаткова арганізуюцца 200 спэцыяльных сталовых з якіх у Менску — 4, у Магілеве — 2, у Гомелі — 3, у Віцебску — 4. Гэтыя сталовыя забясьпечаць у асноўным ўсіх дзяцей рабочых. На арганізацыю сталовых па ўсяму Саюзу — асігнавана 3 мільёна рублёў.

СУПРОЦЬ РАЗГРОМУ ТБШ

Рэзалюцыя пратэсту пісьменьнікаў БССР

Зноў з гоняў падняволенай Заходняй Беларусі даносяцца да нас стогны і крыкі.

Гэта—голас дзяцей, якіх выкінуў фашызм з беларускіх школ. Гэта—галасы з-за крат лепшых прадстаўнікоў рабочае клясы, працоўнага сялянства, правадыроў нацыянальна-вызваленчага руху—**Тарашкевіча, Валошына, Дварчаніна, Гаўрыліка, Вальвіца, Крынчыка і тысячы лепшых сыноў рабоча-сялянскай сям'і.** Гэта зьвяняць ланцугамі дэлегаты зьезду ТБШ. Іх паслалі масы падзяліцца вопытам барацьбы, вызначыць далейшыя шляхі змаганьня. Але дэфэнзыва кінула іх за краты.

Так «вырашаюць» нацыянальнае пытаньне «місіянэры культуры і цывілізацыі» у незалежнай і «дэмакратычнай» Польшчы. **Мы, пісьменьнікі Савецкай Беларусі, ганьбім барбараў XX стагодзьдзя, насьбітоў чорнай рэакцыі, подлых і цынічных фашыстаў-пілсудчыкаў.**

Польскіх імпэрыялістаў сёньня акрыляе надзея, што вось-вось разгарыцца «вогнішча вайны», на якім з прыемнасьцю можна «патрэць скарчанелыя ад крызісу рукі».

Таму яны распачалі свой азьвярэлы паход супроць Савецкага саюзу, азьвярэлы паход на Заходнюю Беларусь, Заходнюю Украіну, дзе нарастае рэвалюцыйная хваля нацыянальна-вызваленчага руху, дзе нарастае грозная хваля нянавісьці і гнеў да катаў і душыцеляў.

Гэтая хваля зьмяце інтэрвэнцыянісцкія плякаты польскіх імпэрыялістаў, і кія стратэгічныя намеры ў падрыхтоўцы да крывавага паходу на бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту.

Польскіх імпэрыялістаў, і іншых фашыстаў-пілсудчыкаў, і іншых фашыстаў-пілсудчыкаў, і іншых фашыстаў-пілсудчык

Навукова-дасьледчая работа БССР у 2-й пяцігодцы

Даклад прэзыдэнта БАН тав. ГОРЫНА на Ўсебеларускай канфэрэнцыі па выпрацоўцы пляну навукова-дасьледчай работы БССР у другой пяцігодцы

Сацыялізм і навука

XV гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі, якая супадае з годам выкананьня першай пяцігодкі і якая прадэманстравала вялікія творчыя сілы пралетарыяту ў будаўніцтве сацыялізму, з нямеркаемай яскравасьцю практычна пацьвердзіла тое палажэньне марксызму, што толькі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту магчыма сапраўднае разьвіцьцё навукі і пераўтварэньне яе ў новую прадукцыйную сілу. Камуністычная партыя, як вядома, нават у самыя цяжкія гады рэвалюцыі была на варце разьвіцьця навуковых установаў. З розгам-жа нашага матар'яльнага дабрабыту партыя настойліва ўвасклівае адносіцца да навукі, што гісторыя літаратурна ня ведае аналёгічнага бурнага разьвіцьця навуковай думкі, якое мы маем у СССР.

Каб ня быць галаслоўным прывяду даныя. У 1800 г. у Расіі было 4 навукова-дасьледчых установы, у 1917 г. 289, а ў 1930 г. у СССР налічвалася да 1.500 навукова-дасьледчых інстытутаў. Адначасова расьлі навуковыя кадры. У 1800 г. царская Расія мела каля 200 навуковых работнікаў, у 1917 г. 4.200, а ў 1930 г. у СССР ёсьць 24.000 чал. Іншымі словамі за 13 год дыктатуры пралетарыяту мы арганізавалі новых 1.200 навуковых установаў і падрыхтавалі каля 20.000 навуковых работнікаў.

Яшчэ больш дзіўныя тэмпы росту навуковых установаў мы маем у БССР таму, што толькі дыктатура пралетарыяту забясьпечвае сапраўднае нацыянальнае вызваленьне мас і рашуча змагаецца за ліквідацыю здэталасьці народных нацыянальных рэспублік, былых да рэвалюцыі калёніямі царскай Расіі. У Беларусі, на мяжы дня рэвалюцыі ніводнай навукова-дасьледчай установы, у сучасны момант налічваецца да 10 навукова-дасьледчых інстытутаў, сярод якіх, напрыклад, Беларуская Акадэмія Навук зьяўляецца адным з буйнейшых навуковых цэнтраў Савецкага Саюзу. Лік навуковых работнікаў Беларусі, якія налічваліся да рэвалюцыі адзінкамі, зараз узрос да 1.500 чал.

Бурныя тэмпы разьвіцьця навукі не зьяўляюцца нечым выпадковым у нашай сацыялістычнай сыстэме. Навука і сацыялізм не адзяляюцца адно ад аднаго, бо як праслына марксызму, так і ў

Шырэй партыйна-масавую работу вакол пастаноў ЦК і СНК

Апублікаваная 30 мая пастанова Бюро ЦК КП(б)Б аб ходзе веснавой сяўбы падкрэсліває, што з боку кіраўніцтва цэлага раду раёнаў не ўсьвядомлена ўся важнасьць своечасовага выкананьня плянаў веснавой сяўбы. На 25 мая плян сяўбы быў выкананы толькі на 32,5 проц. На ступная пяцідзёнка яшчэ таксама патрэбнага зруху не дала. Пастановы ЦК і СНК аб збожжазагатоўках, мясазагатоўках, аб новым с.-г. падатку і разгортваньні калгаснага гандлю ў многіх мясцох да мас не даведзены і такім чынам у дастатковай меры не пераўтвораны ў важнейшы стымул узьняцьця тэмпаў сяўбы.

Матар'ял, які сёньня намі зьмяшчаецца, з усёй відавочнасьцю паказвае, што папулярызацыя гэтых гістарычных пастаноў ЦК і СНК выклікае новы моцны ўздым творчага энтузіязму, новую хвалю сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Патрэбна толькі адлесьціся да прапрацоўкі па-бальшавіцку, а не фармальна. У многіх выпадках партыйныя ячэйкі абмяжоўваюцца калектыўнай чыткай пастаноў на сходах, прычым нават не на масавых сходах. Такая прапрацоўка ня вытрымлівае ніякай крытыкі. Пастановы неабходна абгаварыць на шырокіх сходах ячэек, калгасьнікаў разам з аднаасобнікамі, а таксама асобна прапрацаваць у брыгадах.

Разам з пастановамі павінен быць абгавораны ход сяўбы, арганізацыйна-гаспадарчае становішча калгасу, яго магчымасьці для ўзьняцьця тавар насьці і г. д. Рэзалюцыі гэтых сходаў павінны паказаць разам з вогукам на пастановы партыі і ўраду канкрэтныя шляхі для ажыцьцяўленьня іх. Прычым справа ня толькі ў прыняцьці рэзалюцыі. Неабходна прасачыць за іх выкананьнем, неабходна дабіцца разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў практычным выкананьні пастаноў.

Асабліва вялікая задача ў папулярызацыі рашэньняў ЦК і СНК ускладаецца на партыйныя школы, якія павінны разгарнуць больш глыбокую прапрацоўку, дабіцца як мага большага ахопу прапрацоўкай калгасьнікаў і беднякоў, сераднякоў—аднаасобнікаў.

Як вельмі цікавы трэба адзначыць вопыт Койданаўшчыны, дзе для дапамогі сельскім саветам і партыйным ячэйкам арганізавана спэцыяльная агітпропбрыгада.

Давядзеньне пастаноў партыі і ўраду да шырокіх працоўных мас, правільнае растлумачэньне гэтых пастаноў бязумоўна зьявіцца важнейшым стымулем для патрэбнага пералому ў становішчы сяўбы.

У адказ на пастановы ЦК і СНК датэрмінова ўносяць падатак

Для растлумачэньня раяньняў ЦК і СНК аб збожжа і мясазагатоўках новым палажэньні аб сельгаспадатку і разгортваньні калгаснага гандлю, Азарыцкая парт'ячэйка, Мазырскага раёну, вылучыла ва ўсе калгасы Халмянскага, Азарыцкага і Хабыцкага сельсаветаў брыгадзіраў, якія з сваёй работай справіліся добра.

У адказ на пастановы ЦК і СНК калгасы і калгасьнікі датэрмінова ўносяць авансы ў лік падатку: Камас, Победа саветаў» унёс 200 рублёў, «Новыя Любінавічы»—100 руб., «Асьвета»—31 руб., «Чырвоны Пуцілавец»—50 руб. Члены Халмянскага сельсавету на плёнуме сельсавету датэрмінова ўнесьлі авансы ў лік падатку: Яўласьеў Іван унёс 5 руб., Яўстратаўскі Андрэй—4 руб., Бязэубаў Іван—6 руб., Рак Пятро—4 руб., Рак Іван—6 руб.

Члены Халмянскага сельсавету ўзялі на сябе абавязак правесьці адпаведную работу сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў па датэрміновым унясеньні падатку і выклікалі на сацспаборніцтва Азарыцкі і Хаміцкі сельсаветы.

Ф.

ПАСЬПЯХОВА СКОНЧЫЦЬ СЯЎБУ

Мазыр. Партыйная ячэйка Юравіцкага сельсавету зараз-жа пасьля апублікаваньня апошніх пастаноў партыі і ўраду аб збожжазагатоўках, мясазагатоўках, аб разгортваньні калгаснага гандлю і новага закону аб сельгаспадатку, прыступіла да іх папулярызацыі сярод шырокіх мас калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў.

Пастановы спачатку былі прапрацаваны на партыйных сходах, а потым на сходах калгасьнікаў разам з аднаасобнікамі. Усюды пастановы сустрэнуты з вялікім задавальненьнем і выклікалі новы ўздым працоўнага энтузіязму. У адказ на пастанову ЦК і СНК па ўсім сельсавеце 15 мая быў праведзен суботнік па дапамозе калгасу «Чырвоны Сьцяг» у выкананьні пляну веснавой пасеўкампаніі. У суботніку прынялі ўдзел разам з партыйцамі, камсамольцамі і калгасьнікамі таксама беднякі і сераднякі-аднаасобнікі. У гэты дзень засеяна 5 га лёну і ўзарана ўся плошча пад пасеў. Аказана сацыялістычная ўзаемадапамога калгасу «Ударнік» па вывазцы дасу для будаўніцтва. 7 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак падалі заяву аб прыняцьці іх у калгас «Ударнік».

Гнуткасьць і апэрацыйнасьць у рабоце партячэйкі забясьпечылі Юравіцкаму сельсавету адно з першых месц у радох змагароў за правядзеньне бальшавіцкай сяўбы. Вялікую ролю ў папулярызацыі апошніх пастаноў партыі і ўраду адыгралі насьценныя газэты, якія выдаюцца ва ўсіх калгасах сельсавету.

Аднак, нельга забываць, што сяўба ў Юравіцкім сельсавеце яшчэ далёка не закончана. Калгас «Ударнік» выканаў пасеўплян толькі на 60 проц., калгас «Чырвоны сьцяг»—каля 50 проц., «Працоўная пчала»—таксама.

Далейшая ўпартая настойлівая работа партыйнай ячэйкі па ўкараненьні сацыялістычных мэтадаў працы, па ажыцьцяўленьні шасьці ўмоў т. Сталіна, арганізацыя насьценгазэт ва ўсіх вытворчых брыгадах калгасаў, разгортваньне сацыялістычнай узаемадапамогі аднаасобным сэктарам калгасам і, наадварот,—вось шляхі для пасьпяховага заканчэньня сяўбы і ажыцьцяўленьня пастаноў партыі, накіраваных на далейшае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Файнбэрг.

Сумныя вынікі дрэннай падрыхтоўкі

Бабруйск. (Наш кар.) Бабруйшчына ня выканала дырэктыў партыі аб заканчэньні сяўбы да 20 мая. Процант выкананьня пляну сяўбы па раёне дасягае 60. Калгасамі плян выкананы толькі на 47 проц., саўгасамі—на 77,7 проц. і аднаасобным сэктарам—на 58,9 проц.

Такое ганебнае адставаньне тлумачыцца тым, што падрыхтоўка да сяўбы была праведзена дрэнна. У многіх калгасах брыгады існуюць на паперы. Адзін з лепшых калгасаў раёну калгас «Сьвет», не атрымаўшы патрэбных указаньняў з боку раённых арганізацый, дапусьціў рад памылак у арганізацыі брыгад. У брыгады былі залічаны «мёртвыя душы»—калгасьнікі, служачыя, якія ня ўдзельнічаюць у палявых работах і нават зусім не калгасьнікі.

Асабліва дрэнна выконваюцца пасеўныя пляны ў тых калгасах, дзе дрэнна арганізавана праца. У калгасе імя XVI партэзьезду, Броскага сельсавету, дырэктывы партыі аб арганізацыі сталых брыгад ігнаруюцца, таму плян сяўбы выкананы ўсяго толькі на 10 проц. У калгасе імя Будзённага, Баравіцкага сельсавету, замест зьдзельшчыны існуе падзёншчына, таму плян сяўбы выкананы ўсяго на 12-15 проц.

Сельскія саветы надзвычайна слаба кіруюць ходам сяўбы. Сельсаветы Бортнікаўскі, Любоніцкі, Гарбацэвіцкі выканалі плян сяўбы ўсяго на 20-26 проц.

З боку райкалгасаюзу і МТС кіраўніцтва таксама адсутнічае. У выніку гэтага калгасы МТС за апошнюю пяцідзёнку далі рэзкае зьніжэньне тэмпаў сяўбы. Пры агульным росьце процантаў сяўбы за апошнюю пяцідзёнку на 26 проц. па калгасах МТС проц. сяўбы ўзьняўся толькі на 15.

Упаўнаважаны райкому партыі, на якіх ускладзена адказнасьць за ход сяўбы ў прымацаваных да іх сельсаветах, праявілі злачынную бязьдзейнасьць. Упаўнаважаны Рашкес, Іваноў, Штыцько, Голад, Дайхін, Рамашын займаліся гастралёрствам і нічым практычна сельсаветам не дапамаглі. Шэфствуючыя арганізацыі Лесатэхнікуму, дзяржустаноў, Саюзтрансу, Аўтадору, заводу Адзярыха, Электрастанцыі нічым не дапамаглі сваім падшэфным сельсаветам у правядзеньні сяўбы.

Практыка перадавых сельсаветаў (Варатынскі, Сычкоўскі) і перадавых калгасаў (імя Варочскага, «Чырвоная Бярэзіна», імя Варашылава і інш), якія скончылі сяўбу да тэрміну, яскрава сьведчыць аб тым, што спасылань не на «аб'ектыўныя» прычыны, якімі апартуністы тлумачаць слабы ход па сеўнай кампаніі, нічога агульнага з сапраўднасьцю ня маюць.

Раённы камітэт партыі рашуча ўдарыў па канкрэтных зрыўшчыках сяўбы. Сакратар Продзьвінскай ячэйкі Рыбкавец выключаны з партыі, раду сакратароў парт'ячэек дана вымова. Вымовы атрымалі і вышэйназваныя ўпаўнаважаныя райкому.

Перадавыя калгасы і сельсаветы прэм'яваны.

Пастанова бюро райкому і апошняя пастанова ЦК аб ходзе сяўбы павінна паслужыць рашучым штурхачом ва ўзмацненьні ходу сяўбы. Сяўба ў бліжэйшыя дні павінна быць скончана.

Дамброўскі А., Іомдзін Г.

Пачын, які трэба перанять

Койданаўскі РК КП(б)Б з мэтаю найбольш шырокай папулярызацыі пастаноў ЦК і СНК аб збожжа і мясазагатоўках, аб калгасным гандлі і новым с.-г. падатку, арганізаваў і накіраваў у сельскія саветы раёну агітпропбрыгаду.

Перад агітпропбрыгадай пастаўлена задача: на грунце гэтых гістарычных пастаноў дабіцца ўключэньня ўсіх калгасаў у пяцідзёньнік штурму прыраўваў у сяўбе і ў конкурс на лепшае правядзеньне сяўбы. Адначасова брыгада паставіла сабе мэтай арганізацыю ўдарных брыгад друку і ажыўленьне работы ячэек Асоавіяхіму. Агітпропбрыгада прабудзе ў сельсавете тах да канца сяўбы.

Разам з брыгадай выехалі рэдакцыі раённых газэт «Ударнік Койданаўшчыны» і «Штурмовец Койданаўшчыны», а таксама першая ў БССР аўтакінаперасоўка, якая першы раз робіць свой рэйс па раёнах Савецкай Беларусі.

(Белта).

Заводы па ўдарнаму рыхтуюцца да зьлёту

Падрыхтоўку да зьлёту на баявыя рэйкі

Па ўсіх мэталёапрацоўчых заводах БССР разгарнулася шырокая работа па падрыхтоўцы да Ўсебеларускага зьлёту дэпутацкіх груп мэталёпрамысловасьці:

Асабліва значную работу разгарнуў завод «Камунар» (Менск), які першы падхапіў выклік заводу «Дынама» па паходзе за тэхніка-эканамічную незалежнасьць СССР. Узяўшы на сябе канкрэтныя абавязкі, камунараўцы сапраўды змагаюцца за тэхніка-эканамічную незалежнасьць ад капіталістычных краін. Паставіўшы ў цэнтр сваёй увагі барацьбы за тэхніка-эканамічную незалежнасьць заводу «Камунар» будзе рапартаваць зьлёту аб сваіх перамогах у гэтым напрамку.

Значная работа па падрыхтоўцы да зьлёту разгарнулася на заводах г. Віцебску. Дэпутацкія групы заводу «Чырвоны Мэталіст» і «Камінтэрн» бяруцца за тэхніка-эканамічную незалежнасьць паставілі на баявыя тэмпы.

Усё гэта паказвае, што падрыхтоўка да зьлёту дэпутацкіх груп мэталёпрамысловасьці, ператварылася ў паход мас за тэхніка-эканамічную незалежнасьць СССР, барацьбу за фінплян, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Усебеларускі зьлёт дэпутацкіх груп мэталёпрамысловасьці пакажа перадавых барацьбітоў за тэхніка-эканамічную незалежнасьць нашай краіны, пакажа нам сапраўдных змагароў за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Дагнаць і перагнаць у найкарацейшы тэрмін перадавыя капіталістычныя краіны ў тэхніка-эканамічнай незалежнасьці—баявая задача, якую павінен вырашыць Усебеларускі зьлёт. Гэта задача павінна стаць у цэнтр увагі штодзённай работы кожнай дэпутацкай групы, кожнага сумленага рабочага, кожнага заводу цалкам.

Выкананьне ў тэрмін заказаў для чорнай мэталюргіі, таксама адна з задач нашага дня і яна павінна стаць у цэнтр увагі работы зьлёту.

Дэпутацкія групы мэталёзаводаў! Узмацняйце барацьбу за тэхніка-эканамічную незалежнасьць СССР, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за ўзмацненьне абароназдольнасьці нашай краіны.

Дэпутацкая група заводу „Камунар" у барацьбе за тэхніка-эканамічную незалежнасьць

Дэпутацкая група заводу «Камунар» сустракае першы Ўсебеларускі зьлёт дэпутацкіх груп мэталёпрамысловасьці з вялікімі дасягненьнямі.

За час свайго існаваньня яна змагла згуртаваць вакол сябе актыў з 160 чалавек лепшых рабочых—ударнікаў, якія сваёй зацікаўленасьцю здолелі ахапіць рад пытаньняў вытворчага і бытавога характару. Усю работу дэпутацкая група заводу «Камунар» праводзіць брыгадным мэтадам.

На сённішні дзень пры дэпутацкай групе налічваецца 16 сталых брыгад, якія прымацаваны да розных галін работы (ЗРК, сталоўка, прыгарадная гаспадарка, БРЫЗ, Бюро рацыяналізацыі, дзіцячага саду, па ліквідацыі няпісьменнасьці, беларусізацыі, па вытворчых пытаньнях, жыльлёвых, фінсправах і г. д.).

У кожным цэху арганізаваны кантрольны пост, які сыгналізуе аб рабоце і недахопах у цэху.

Сваю работу дэпутацкая група праводзіць па пляне і рэгулярна заслухоўвае справаздачу пастоў.

У барацьбе за выкананьне прамфінпляну, за колькасныя і якасныя паказьнікі, дэпутацкая група дабілася рэальных вынікаў. Прамфінплян даведзен да кожнага варштату, да кожнага рабочага. Дэпутацкая група прыймала актыўны ўдзел у пераводзе цэхаў на гаспадарчы разьлік, пераводзе рабочых на прэм'яльна-прэгрэсыўную зьдзельшчыну і арганізацыі гаспадарча-разьліковых брыгад.

Дзякуючы гэтай рабоце дэпутацкай групы мы маем, што 10 брыгад і ўсе цэхі пераведзены на гаспадарчы разьлік. У сваёй штодзённай працы дэпутацкая група вяла барацьбу з ліквідацыяй абязьлічкі, ураўнілаўкі, з лятунствам і прагульшчыкамі, скарыстоўваючы для гэтай мэты вытворчыя нарады, чорныя дошкі, грамадзкія суды, насьценгазэты і шматтыражкі.

У сваёй прыгарадной гаспадарцы дэпутацкая група арганізавала кантрольны пост і прымацавала да гаспадаркі сталую брыгаду з 5 чалавек.

Значную работу правяла дэпутацкая група ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Сумесна з партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі дэпутацкая група дабілася, што ўвесь транспарт, які мае завод, быў прадстаўлен прыгараднай гаспадарцы, а таксама праз гарпрафсавет былі даны 3 аўтамашыны для вывазкі гною арганізавалі 2 суботнікі з удзелам 20 чалавек.

Шляхам штодзённага кантролю над ЗРК і крамамі група дабілася ліквідацыі чаргі, вывешваюцца расцэнакі на кожным тавары пасобку, дэталёвага ўліку, больш правільнага разьмеркаваньня дэфіцытных тавараў, павялічэньня сеткі загатоўчых пунктаў і г.д.

Уязьнесьнем сваіх прапаноў у работу БРЫЗ-у і Бюро рацыяналізацыі дэпутацкая група дабілася таго, што гэтай работай кіруюць працаздольныя таварышы, рэалізуюцца прапановы ня больш, чым праз 10 дзён, і разглядаюцца ў прысутнічаньні рабочага, які дае прапанову.

Дэпутацкая група першая ўзьняла пытаньне аб арганізацыі дзіцячага саду і ясель пры заводзе, адпукала па мяшканьне для дзіцячага саду і ўзяла пад свой кантроль рамонт памяшканьня. Зараз пры заводзе ёсьць дзіцячы сад на 50 дзяцей і ясьлі на 30 дзяцей.

У выніку вялікай работы, якую правяла дэпутацкая група па выкананьні фінпляну—100 проц. рабочых заводу ахоплены падпіскай на пазыку «3-ці рашаючы», 803 чалавекі ахоплены страхоўкай і ўсе рабочыя зьяўляюцца ўкладчыкамі ашчадкасы.

Выклік заводу **«Дынама»** дэпутацкая група заводу **«Камунар»** падхапіла і выклікала ўсе дэпутацкія групы мэталёапрацоўчых заводаў БССР уключыцца ва Ўсесаюзны паход за эканамічную незалежнасьць СССР. Вылучана па паходзе вытворчая брыгада наглядае за тым, як скарыстоўваецца ў цэхах імпартнае абсталяваньне і сочыць за тым, як беражліва рабочыя адносяцца да гэтых машыні інструмантаў.

Дэпутацкая група ўзяла шэфства над бульбакамбайнам, які зараз вырабляецца і паставіла пытаньне перад адміністрацыяй аб вылучэньні яшчэ 2 канструктараў для вырабу бульбакамбайну і зьвярнулася ў сельскагас падарчы навукова-дасьледчы інстытут з тым, каб ён зацікавіўся бульба камбайнамі і дапамог хутчэй скончыць выраб першага камбайну. Брыгада сумесна з рэдакцыяй газэты «Рабочий» абсьледвала як скарыстоўваецца імпартнае абсталяваньне на дрэваапрацоўчым заводзе імя Молатава. У сучасны момант брыгада правярае заяўкі на імпартнае абсталяваньне ў Белмэталяваб'яднаньні.

Пад кіраўніцтвам партыйных і прафэсіяналных арганізацый дэпутацкая група заводу «Камунар» павінна яшчэ больш разгарнуць сваю работу за тэхніка-эканамічную незалежнасьць СССР.

Д—на.

Мэталёзаводы Віцебшчыны рыхтуюцца да зьлёту

(Наш спэцкор).

Мэталёапрацоўчыя прадпрыемствы Віцебска па-баявому рыхтуюцца да Ўсебеларускага зьлёту дэпутацкіх груп мэталёпрамысловасьці.

Добра рыхтуецца дэпутацкая група заводу «Камінтэрн». У парадку ўзмоцненай падрыхтоўкі да зьлёту дэпутацкая група ўзяла шэфства на тэрміновае выкананьне заказу для Віцебскай лямпавай фабрыкі, які (заказ) павінен працуючай брыгадзе на даным заказе (рвацтва, няўважлівыя адносіны да выкананьня работы) мог зацягнуцца.

Старшыня дэпутацкай групы, высока кваліфікаваны сьлесар тав. Фрышман, выкрыў «работу» рвачоў і заказ быў пераданы другой брыгадзе, якая яго датэрмінова выканала.

Пры непасрэдным удзеле дэпутацкай групы даручан заводу «Камінтэрн» выраб варштатаў для Саюзтытуну, а таксама заводам выраблена 10 варштатаў для лямпавай і тэкстыльнай фабрык, аслабаніўшы іх ад увозу варштатаў з-за граніцы. Побач з гэтым дэпутацкая група штодня вядзе сыстэматычную барацьбу за эканомнае выдаткаваньне мэталю.

Дэпутацкая група мэталёзаводу «Чырвоны Мэталіст» таксама ўзмоцнена рыхтуецца да Ўсебеларускага зьлёту.

Дэпутацкая група пытаньне падрыхтоўкі да зьлёту паставіла на цэхавых сходах, завастрыўшы ўвагу рабочых на ўзмацненьне барацьбы за тэхніка-эканамічную незалежнасьць.

У выніку праведзенай работы пачалі паступаць ад рабочых заявы па ўдасканаленьні машын і варштатаў, а таксама вырабе запасных частак для заводзкага імпартнага абсталяваньня.

Рабочы сьлесарна-зборачнага цэху тав. Багуноў узяў на сябе ініцыятыву вырабіць з рускай сталі зубы для цыркулярнай пілы па рэзцы мэталю, якія раней імпартаваліся з-за граніцы.

Дэпутацкая група стварыла брыгаду завочнага актыву па праверцы работы гаспадарча-разьліковых брыгад. У выніку было выяўлена, што ў рабоце гаспадарча-разьліковых брыгад меўся рад дэфэктаў (адсутнасьць уліку, несвачасовая дастаўка матар'ялаў і рад інш.). Зараз дэфэкты зьнішчаны.

Дзякуючы актыўнай дапамозе дэпутацкай групы ў справе выкананьня сваіх вытворчых заданьняў, завод «Чырвоны Мэталіст» у першым квартале прамфінплян выканаў на 96,4 проц., у красавіку на 104 проц., а з 1 па 20 мая—на 90,7 проц.

У падрыхтоўку да зьлёту ўключылася газэта «Віцебскі Пралетары», разгарнуўшы на сваіх старонках агляд гатоўнасьці дэпутацкіх груп да Ўсебеларускага зьлёту.

Дэпутацкія групы мэталёзаводаў Віцебшчыны павінны рапартаваць зьлёту аб сваіх дасягненьнях на фронце барацьбы за тэхніка-эканамічную незалежнасьць СССР.

Межарыцкі

Пра мерапрыемства па арганізацыі пашыўкі вопраткі і абутку ў парадку індывідуальных заказаў

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Бяручы пад увагу што швэйная і скураная прамысловасьць шыюць усю вопратку выключна, а абутак пераважна стандартнага тыпу і тым самым паўзбавілі спажыўца магчымасьці выбару вопраткі і абутку па сваім густу і магчымасьці індывідуальнага заказу на пашыўку вопраткі і абутку. Савет Народных Камісараў БССР на падставе пастановы СНК Саюзу ССР за 10 красавіка 1932 г. «Пра мерапрыемствы па арганізацыі пашыўкі вопраткі і абутку ў парадку індывідуальных заказаў і па арганізацыі рамонтных і пашывачных майстэрняў вопраткі і абутку» (З. З. СССР 1932 г. № 27, арт. 166) пастанаўляе:

1. Даручыць Народнаму Камісарыяту Лёгкай Прамысловасьці і Белкапрамсаюзу арганізаваць пашыўку гатовай вопраткі па індывідуальных заказах у гарадох: Менск, Віцебск, Гомель, Магілеў, Бабруйск і Барысаў.

Прыняць да ведама заяву Народнага Камісарыяту Лёгкай Прамысловасьці, што на 2 квартал 1932 г. для гэтай мэты вызначэн фонд мэтражу суконнага ў 39,7 тыс. мэтр., паперовых тканін у 41,7 тыс. мэтр. і гэты фонд разьмяркоўваецца наступным чынам: Менск—30 проц., Віцебск—20 проц., Гомель—20 проц., Бабруйск—10 проц., Магілеў—10 проц., Барысаў—10 проц.

2. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Лёгкай Прамысловасьці вылучыць для прамкаапэрацыі гарадоў—Бабруйск і Барысаў 20 проц. сэйчо мэтражу.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Лёгкай Прамысловасьці разгарнуць работу так, каб забясьпечыць скарыстаньне вылучаных фондаў і на працягу 5 дзён устанавіць адносную вагу прамкаапэрацыі ў справе пашыўкі вопраткі і абутку ў парадку індывідуальных заказаў, паведамляючы аб гэтым Савет Народных Камісараў БССР.

Катэгорычна забараніць выдаткаваньне фондаў, якія вылучаюцца для выкананьня індывідуальных заказаў, на пашыўку стандартнай вопраткі, для чаго прапанаваць кожнаму вытворчаму аб'яднаньню і прамкаапэрацыі весьці асобны вучот паказаных фондаў.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Лёгкай прамысловасьці, спажывецкай каапэрацыі і прамкаапэрацыі арганізацыі да 25 мая г. г. ня менш 11 пунктаў па прыёму заказаў праз сваю спэцыялізаваную гандлёвую сетку:

Менск 2 пункты (Белшвэйаб'яднаньне 1, Белкапсаюз 1).

Гомель 2 пункты (Белшвэйаб'яднаньне 1, Белкапсаюз 1).

Віцебск 2 пункты (Белшвэйаб'яднаньне 1, Белкапсаюз 1).

Магілеў 2 пункты (Белшвэйаб'яднаньне 1, Белкапсаюз 1.).

Бабруйск 2 пункты (Прамкаапэрацыя 1, Белкапсаюз 1).

Барысаў 1 пункт (Прамкаапэрацыя 1).

4. Устанавіць, што ў г.г. Менску, Віцебску, Гомелі і Магілеве прыём індывідуальных заказаў праводзіцца роўнымі часткамі праз спажывецкую каапэрацыю і гандлёвую сетку дзяржпрамысловасьці.

5. Устанавіць, як правіла, што заказчык робіць заказ і атрымоўвае яго ў адпаведным прыёмным гандлёвым пункце, прычым Народны Камісарыят Лёгкай Прамысловасьці абавязан на дагаворных пачатках з спажывецкай каапэрацыяй пастаўіць працу гандлёва-прыёмачных пунктаў так, каб у гэтых пунктах пра водзілася зьняцьцё меркі, прымерка, і зьвязаныя з гэтым іншыя працэсы.

6. Абавязаць Белкапсаюз на працягу месяца арганізаваць 20 майстэрняў па перароблы, рамонту, прэсаваньні і фарбаваньні гатовага адзеньня.

Прыняць да ведама заяву Старшыні Белкапрамсаюзу т. Брыскіна аб тым, што па лініі прамысловай каапэрацыі ўжо арганізаваны 1 дзейнічаюць каля 100 пачынаючых майстэрняў і прапанаваць Белкапрамсаюзу пашырыць сваю сетку да 150 майстэрняў.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Лёгкай Прамысловасьці забясьпечыць пачынаючыя і рэстаўрацыйныя майстэрні прамкаапэрацыі і спажывецкай каапэрацыі, мернай тканінай, ласкутом і нитками.

7. Даць пакупніку, які мае ордэр на гатовую вопратку, права замяняць яе адрэзам матэрыялу, для чаго пры выпісцы на ордэры рабіць адпаведную адзнаку.

Заказы на пашыўку вопраткі прымаюцца па ордэрах, якія выдаюцца адпаведнымі каапэрацыйнымі арганізацыямі (ЗРК і ЗР) для набыцьця гатовай вопраткі альбо адрэзу матарыялу. Па гэтых самых ордэрах швэйная прамысловасьць і магазыны вядуць вучот матарыялаў і заказаў.

У магазынах павінен быць забясьпечэн усебаковы выбар як фасонаў вопраткі, таксама матарыялу.

Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Лёгкай Прамысловасьці і Белкапрамсаюзу і спажыўкаапэрацыі індывідуальных заказы з матарыялаў заказчыка прымаць без ордэру у неабмежаванай колькасьці.

8. Абавязаць Беларускую Кантору «Саюзскур», Белкапсаюз і Белкапрамсаюз арганізаваць прыём індывідуальных заказаў на пашыўку новага абутку для дарослага і дзіцячага насельніцтва ў спэцыялізаваных магазынах па продажу абутку і ў абутковых аддзяленьнях універсальных магазынаў, а Бел. Кантору «Саюзскур» і прамкаапэрацыю забясьпечыць своечасовае выкананьне заказаў.

9. Абавязаць Беларускую Кантору «Саюзскур» і прамкаапэрацыю арганізаваць пашыўку абутку па індывідуальных заказах у колькасьці 40 тыс. пар на працягу 1932 г. у гарадох: Менск, Віцебск, Гомель, Магілеў, Бабруйск і Барысаў.

Устанавіць наступнае разьмеркаваньне паказанай колькасьці:

Менск — 13 тыс. пар.
Віцебск — 9 тыс. пар.
Гомель — 9 тыс. пар.
Магілеў — 5 тыс. пар.
Бабруйск — 2 тыс. пар.
Барысаў — 2 тыс. пар.

з вызначанай для пашыўкі па індывідуальных заказах 40.000 пар абутку 10.000 пар абутку выпрацоўвае ў гор. Менску Бел. Кантора «Саюзскур», а астатнія 30.000 пар прамкаапэрацыя.

Абавязаць Беларускую Кантору «Саюзскур» у адпаведнасьці з гэтым пастановаю забясьпечыць патрэбнай сыравінай майстэрні як па лініі «Саюзскур», а таксама і па лініі прамысловай каапэрацыі.

Адначасова забясьпечыць прыём заказаў з матарыялаў заказчыка ў неабмежаванай колькасьці.

10. Індывідуальныя заказы на пашыўку новага абутку прымаюцца па ардэрох, якія выдаюцца для набыцьця гатовага абутку. Па гэтых самых ордэрох прадпрыемствы і майстэрні, якія выконваюць заказы, а таксама і магазыны, якія прымаюць заказы, павінны весьці вучот матэрыялаў і заказу.

Фонды матарыялаў, вылучаныя для выкананьня індывідуальных заказаў, не павінны выдаткоўвацца на пашыўку стандартнага абутку, для чаго скураная прамысловасьць і прамысловая каапэрацыя павінны ўстанавіць асобы вучот гэтых фондаў.

Апрача таго, даручыць Бел. Канторы «Саюзскур» і прамкаапэрацыі арганізаваць пашыўку і продаж абутку асаблівага высокай якасьці і разнастайнага фасону па рыначных цэнах.

11. Прапанаваць Белкапсаюзу і прамысловай каапэрацыі распрацаваць плян пашырэньня сеткі майстэрняў па рамонту і рэстаўрацыі абутку.

12. Даручыць Белкапсаюзу з удзелам ЦСПОБ разьмяркаваць талёны на індывідуальныя заказы па гатовай вопрацы і па абутку ў першую чаргу паміж важнейшымі прадпрыемствамі, забясьпечыўшы ў першую чаргу ўдарнікаў з рабочых і інжынэрна-тэхнічных работнікаў.

13. Абавязаць старшынь гарадзкіх саветаў і раённых зьканаўчых камітэтаў тых гарадоў, дзе будзе рабіцца прыём індывідуальных заказаў і адчыняцца пачынаючыя майстэрні пад іх асабістую адказнасьць на працягу двох тыдняў забясьпечыць дзяржпрамысловасьць, спажывецкую каапэрацыю і прамысловую каапэрацыю неабходным памяшканьнем.

14. Абавязаць Народны Камісарыят Лёгкай Прамысловасьці, Белкапсаюз і Белкапрамсаюз на працягу дэкады устанавіць асартымэн вырабляемай прадукцыі, парадак выкананьня заказаў і цэны і падаць на зацьверджаньне Эканамічнага Савету БССР.

15. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Лёгкай Прамысловасьці, Белкапрамсаюзу і Белкапсаюзу пачаць прыёмку заказаў не пазьней 1 чэрвеня, забясьпечыўшы добраякаснае абслугоўваньне спажыўца 1 поўнае задавальненьне якасных запатрабаваньняў заказчыка.

16. Даручыць Народнаму Камісарыяту Лёгкай Прамысловасьці, Белкапсаюзу і Белкапрамсаюзу праз 2 месяца далажыць Савету Народных Камісараў пра ход выкананьня гэтай пастановы.

17. Даручыць Народнаму Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі прасачыць за выкананьнем гэтай пастановы

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР А. Калнін.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР С. Кандыбовіч.

27 мая 1932 г.
г. Менск.

Шырэй фронт тэхнічнай пропаганды на транспарце

(Гутарка з брыгадзірам сталінскай эстафэты на транспарце праф. А. М. Мануйлавым)



Шпаркае сацыялістычнае будаўніцтва СССР настойліва высоўвае задачу аб аўладаньні тэхнікай. Гістарычны лёзунг тав. Сталіна «тэхніка ў пэрыяд рэканструкцыі вырашае ўсё», абавязвае ўсю тэхнічную інтэлігенцыю Саюзу, а ў першую чаргу навуковых работнікаў ВТНУ кінуць свае сілы і веды на адказнейшы фронт тэхнічнай прапаганды.

Відучы работу па тэхнапрапагандзе на транспарце, мы, брыгада Варнітсо сталінскага эксплёатацыйнага інстытуту інжынэраў транспарту — прафэсары і выкладчыкі ў падавану гістарычнага лёзунгу тав. Сталіна аб тэхнапрапагандзе абвясьцілі сталінскую эстафэту **ВАРНІТСО.** Гэтую эстафэту мы разгарнулі пад сьцягам выкананьня рашэньняў XVII партыйнай канфэрэнцыі і сацыялістычнымі мэтадамі пры дапамозе партыйных арганізацый абавязаліся ўдарна скончыць эстафэту па 1-га ліпеня 1932 года.

У склад нашай брыгады па сталінскай эстафэце ВАРНІТСО уваходзяць 45 чалавек, сярод іх членамі брыгады зьяўляюцца: **я, праф. Зярноў, праф. Лебедзеў, праф. Крукаў, праф. Гібшман, праф. Герольскі, дацэнт Нікіцін, студэнт Кацоеў, дацэнт Антошын, асыстэнт Кулагін, праф. Майшаў, дацэнт Страхаў, праф. Міцюшын, праф. Гарлізнаў, праф. Лядоўскі і інш.**

Абвясьціўшы эстафэту аб'яднаныя брыгады ВАРНІТСО прынялі на сябе абавязацельства арганізаваць і правесьці на дарогах Маскоўскага вузла вытворчыя палітэхнічныя курсы брыгадзіраў, на МББ чыгунцы — курсы брыгадзіраў будаўнікоў, на Маскоўска - Казанскай чыгунцы курсы брыгадзіраў эксплёатацыйнікаў тэхнічнай спэцыяльнасьці, на Маскоўска-Казанскай чыгунцы курсы брыгадзіраў эксплёатацыйнікаў камэрцыйнай спэцыяльнасьці. Мэта гэтых курсаў даць дарогам сьвядомых, палітычна разьвітых і тэхнічна ўзброеных ударнікаў брыгадзіраў рознай тэхнічнай спэцыяльнасьці.

Гэта па сутнасьці першы этап сталінскай эстафэты.

Другі этап сталінскай эстафэты зводзіцца да арганізацыі ў гэтых трох дарогах па лініі і буйных вузлавых пунктах навукова - тэхнічных лекцый па радзе актуальных транспартных тэм, зьвязаных з рэканструкцыяй транспарту.

Трэці этап нашай эстафэты гэта арганізацыя і правядзеньне абсьледваньня транспартных клюбаў у галіне тэхпрапаганды. Мэта абсьледваньня клюбаў заключаецца ня толькі ў высьвятленьні пытаньня аб тым, як вядзецца тэхпрапаганда на транспарце, але і ў дапамозе клюбам у арганізацыі гэтай работы.



Сталінская эстафэта тэхпрапаганды на транспарце. Курсы брыгадзіраў-будаўнікоў МББ чыг.

25 мая сталінская эстафэта тэхпрапаганды на транспарце выехала ў другі рэйс па МББ чыгунцы. Маршрут рэйду Масква - Вязьма - Смаленск - Ворша - Менск - Віцебск-Вялікія Лукі - Ржэў - Масква. У рэйдзе ўдзельнічаюць праф. Мануйлаў, праф. Міцюшын, праф. Маішаў, дацэнт Іваноў, асыстэнт Грыгор'еў і асыстэнт Калужын.

За гэты час нашай брыгадай у БССР праведзена наступная работа. У гор. Воршы, праф. Маішаў прачытаў лекцыю аб навейшых зрухах у тэхніцы чыгуначнага транспарту. Праф. Мі

Шырока разгарнуць калгасны гандаль

Пастанова Наркамзему СССР і Калгасцэнтру СССР

У выкананьне пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 6 і 10 мая і ЦВК і СНК СССР ад 20 мая, калегія Наркамзему СССР і праўленьне Калгасцэнтру СССР пастанаўляюць:

1. Прапанаваць рэспубліканскім наркамземам, земкіраўніцтвам, калгассаюзам і спэцыяльным калгасным цэнтрам:

а) неадкладна камандыраваць неабходную колькасьць работнікаў на месцы для шырокай прапрацоўкі з калгасамі і калгаснікамі паказаных вышэй пастаноў;

б) пры прапрацоўцы зьвярнуць асаблівую ўвагу на пашырэньне пасеваў збожжавых, гародніны, адкорм і наогул жывёлы, гадоўлю маладняка, птушкі, трусоў, на павышэньне тавароснага выхаду малака, пладоў і г. д., каб за гэты кошт азбясьпечыць стварэньне дадатковых тавараных фондаў для разьвіцьця гандлю калгасаў і калгаснікаў;

в) праверыць на справе выкананьне пастановы ЦВК і СНК СССР ад 20 мая ў частцы вызваленьня ад сельскагаспадарчага падатку і мясовых збораў, а таксама і зьніжэньня арэндных платы за гандлёвыя памяшканьні для калгасаў і калгаснікаў;

г) сумесна са спажывецкай, саматуж на-прамысловай кааперацыяй і дзяржгандлем намеціць разьмяшчэньне іх гандлёвай сеткі ў мясцох найбольшай рэалізацыі прадукцыі калгасаў і калгаснікаў;

д) сумесна з калгасамі і калгаснікамі неадкладна прыступіць да разгортваньня іх гандлю (намеціць колькасьць магазынаў, што адкрываюцца, ларкоў, палатак і савецкіх базараў).

2. Кіраўніцтва гандлем калгасаў і калгаснікаў ажыцьцяўляецца Калгасцэнтрам СССР.

Апэрацыйную работу па арганізацыі гандлю калгасаў, маючых таварныя фэрмы, і калгаснікаў, уваходзячых у гэтыя калгасы, усклаць адпаведна на спэцыяльныя калгасныя цэнтры.

Абавязаць праўленьне Трактарацэнтру і дырэктароў МТС аказваць усямерную садзейнасьць разьвіцьцю гандлю калгасаў і калгаснікаў у раёнах дзейнасьці МТС.

3. Не дапускаць адміністрацыйнага прымацаваньня калгасаў і калгаснікаў да магазынаў і ларкоў, што арганізуюцца калгаснымі саюзамі і спэцыяльнымі цэнтрамі. Устанавіць, што дастаўка тавараў калгасамі і калгаснікамі ў гэтыя магазыны праводзіцца толькі на аснове добраахвотных згод іх з магазынамі.

4. Прапанаваць праўленьням калгасных цэнтраў неадкладна прыступіць да разгортваньня ўласнага гандлю сеткі саюзаў і калгасных цэнтраў з тым, каб у бліжэйшы час было адкрыта ня менш 1050 магазынаў калгасных саюзаў і цэнтраў, з іх па лініі Плодагароднінакалгасцэнтру—500, Мясакалгасцэнтру—400, Сьвінаводкалгасцэнтру—120, Аўцаводкалгасцэнтру—30.

5. Зьвярнуць асаблівую ўвагу праўленьням калгасаў і калгаснікаў на тое, што кулацкія і спэкуляцыйныя элемэнты будуць штурхаць іх пад відам гандлю на разбазараньне асноўнага капіталу калгасаў (продаж рабочай жывёлы, асноўнага стада, таварных фэрм, маёмасьці і г. д.), а таксама на правядзеньне гандлю за кошт прадукцыі, якая падлягае здачы дзяржаве. Супроць падобных спроб трэба весьці рашучую барацьбу.

6. Для гандлёвай работы ў калгасах павінны быць вылучаны лепшыя калгаснікі з вызваленьнем іх ад іншай работы. Ніякім чынам не дапускаць прасякненьня ў калгасны гандаль былых гандляроў, перакупшчыкаў, спэкулянтаў і асоб, дыскрэдытаваўшых сябе на кааперацыйным і дзяржаўным гандлі.

7. Сродкі, якія выручаюцца ад продажу калгаснай прадукцыі, за вылікам расходаў па гандлі і падаткаў з гандлёвага звароту, а таксама аддлічэньні ў непадзельны капітал (10—15 проц.), выдаваць калгаснікам у лік ужо адпрацаваных працадзён не радзей аднаго разу ў месяц.

8. Аплата працы калгаснікаў, зайнятых продажам калгаснай прадукцыі праз магазыны, ларкі і палаткі і на савецкіх базарах, устанаўляецца праўленьнямі калгасаў, у залежнасьці ад колькасьці прададзенай прадукцыі і гандлёвага звароту; пры гэтым павінна быць улічана неабходнасьць зацікаўленасьці работнікаў у калгасным гандлі, у правільнай арганізацыі гэтай справы і ў павялічэньні аб'ёму прададзенай прадукцыі.

9. Работа калгасных магазынаў, ларкоў, палатак і савецкіх базараў павінна быць пабудавана такім чынам, каб пры мінімальных гандлёвых расходах, яна спрыяла прыцёку неаграмаджанай часткі таварнай прадукцыі калгасаў і прадукцыі працоўных аднаасобнікаў. Для гэтага праўленьні калгасаў павінны ўстанавіць мінімальную плату на пакрыцьцё расходаў па продажы (у магазыне, ларку, палатцы) прадукцыі калгаснікаў і працоўнага аднаасобніка і забясьпечыць правядзеньне неадкладнага разьліку за дастаўленую прадукцыю.

10. У мэтах устанаўленьня адказнасьці за захаванасьць прадукцыі, што адпраўляецца для продажу, праўленьне калгасу назначае адказных асоб, абавязаных здаць яе па прызначэньні, а атрыманыя ад продажу грошы ў той-жа дзень адказным за продаж асобам здаваць на спэцыяльны бягучы рахунак калгасу ў бліжэйшай ашчаднай касе, або аддзяленьні дзяржбанку.

11. Праўленьні калгасаў нясуць поўную адказнасьць за захаваньне пастановы ЦВК і СНК СССР ад 20-V—аб продажы калгаснай прадукцыі па цэнах, якія складаюцца на рынку. Для гэтага яны сумесна з рэвізійнымі камісіямі калгасаў устанаўляюць адпавед ны пастаянны кантроль за работай магазынаў, ларкоў і палатак, а таксама і за рэалізацыяй калгаснай прадукцыі на савецкіх базарах.

12. Праўленьні калгасаў з самага пачатку павінны забясьпечыць правільны ўлік паступаючай для рэалізацыі калгаснай прадукцыі, фактычна выручаных ад продажу сум гандлёвых расходаў, аддлічэньняў і выдачы калгаснікам грошай ад гандлю ў лік адробленых працадзён.

13. Праўленьні калгасаў павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на правільную арганізацыю работы на савецкіх базарах, у прыватнасьці:

а) шырока разгарнуць гандаль калгаснай прадукцыі на савецкіх базарах;

б) прадастаўляць для груп калгаснікаў без затрыманьняў транспарт, неабходны для падвозкі прадукцыі на базары;

в) разам са спажывецкай кааперацыяй спрыяць групам калгаснікаў у наладжаньні спэцыяльных месц, ларкоў і палатак на базарах;

г) прадаставіць калгаснікам вольную тару, якая ёсьць у калгасах, для перакідкі іх прадукцыі;

д) праўленьні райкалгассаюзаў і ўпаўнаважаныя спэцыяльных калгасных цэнтраў павінны арганізаваць на савецкіх рынках спэцыяльныя кансультацыі праз сваіх інструктароў па пытаньнях гандлю калгасаў і калгаснікаў.

Праўленьні калгасаў і калгаснікаў павінны мець на ўвазе, што работа на разгортваньні гандлю калгасаў і калгаснікаў павінна праводзіцца пад знакам павышэньня якасных паказьнікаў, іх вытворчай работы, павялічэньня тавару прадукцыі і змаганьня з кулацтвам, спэкулянтамі і перакупшчыкамі, якія прабуюць пажыцца на калгасным гандлі.

Нам. Народнага Камісара Земляробства СССР
ЦЫЛЬКО.

Старшыня праўленьня Калгасцэнтру СССР КАТАЕЎ.

Арганізацыя працы на калгасных малочных таварных фэрмах і фэрмах вырасьліваньня маладняку па БССР

Пастанова праўленьня Калгасцэнтру БССР

1. Палажэньне аб арганізацыі працы на калгасных малочных таварных фэрмах і фэрмах вырасьліваньня маладняка зацьвердзіць. Прасіць рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» зьмясьціць палажэньне аб арганізацыі працы і прыкладныя нормы выпрацоўкі ў бліжэйшых нумарах газэты. Прасіць Бел. Дзяржвыдавецтва выдаць палажэньне асобнай брашурай тыражом 10.000 экзэмпляраў.

2. Абавязаць Калгассаюзы, райканторы і райупаўнаважаных Мясамалакоры і райупаўнаважаных Мясамалакоры калгассаюзу, а таксама праўленьні калгасаў і загадчыкаў фэрм у найкарацейшы тэрмін давесьці палажэньне да кожнай фэрмы і калгасьніка, працуючага на фэрме, арганізаваць шырокую прапрацоўку яго на вытворчых нарадах, брыгадах і сходах калгаснікаў, дабіўшыся правільнай арганізацыі працы на аснове зьдзельшчыны.

3. Адмяніць палажэньне аб унутраным распарадку і арганізацыі працы на фэрмах, выданае ў 1931 годзе асобнай брашурай і апублікаванае ў газэце «Савецкая Беларусь» ад 26-IX-31 г.

Старшыня Калгасцэнтру БССР МІЦЬКОЎ.

29 мая 1932 г.

I. Брыгада—важнейшае зьвяно ў арганізацыі працы

1. Для работы на фэрме калгас арганізуе адну або некалькі брыгад з сталым складам калгаснікаў і ў першую чаргу калгасьніц, маючых вопыт у рабоце па жывёлагадоўлі і любячых гэтую справу.

2. Вызначаныя калгаснікі замацоўваюцца для работы на фэрме на тэрмін ня менш аднаго году.

3. На малочных таварных фэрмах з пагалоўем да 100 кароў а на фэрмах вырасьліваньня маладняка да 200 галоў, арганізоўваецца адна брыгада. У даным выпадку загадчык фэрмай адначасова зьяўляецца і брыгадзірам. На больш буйных фэрмах арганізоўваецца некалькі брыгад з разьліку адна брыгада на скотны двор у 100 кароў. Калі фэрма мае дробныя скотныя двары, дык кожная брыгада абслугоўвае некалькі скотных двароў з такім разьлікам каб на кожную брыгаду прыходзілася 80—100 кароў.

4. У склад брыгады павінны ўваходзіць — скотнікі скотніцы-даяркі, начныя вартаўнікі, пастухі, транспартныя работнікі, абслугоўваючыя даную групу жывёлы. Каб канчаткова ліквідаваць абязьлічку на чаткова ліквідаваць абязьлічку на скотным двары і поўнасьцю загрузіць скотным двары і поўнасьцю загрузіць рабочы дзень даяркі, неабходна аба вязкі па даеньню, кармленьню і даглядзе за каровамі аб'яднаць ў адной ляду за каровамі аб'яднаць ў адной асобе—скотніцы—даярцы.

5. На малочных фэрмах з колькасьцю цялят і маладняку ад 200 галоў і больш для ўходу за маладняком арганізоўваецца спэцыяльная брыгада. У тых выпадках, калі пагалоўе маладнякі менш 200 штук, спэцыяльная брыгада не арганізоўваецца, а калгасьніцы, абслугоўваючыя маладняк, уваходзяць у склад адной з брыгад на фэрме. У такіх выпадках работай па ўходу за цялятамі і маладнякам павінна кіраваць старшая цялятніцы, якая нараўне з астатнімі калгасьніцамі абслугоўвае замацаваную за ёй групу маладняку і адначасова ад казвае за работу ўсёй групы калгасьніцаў і калгасьніц, абслугоўваючых цялят і маладняк.

6. З пераходам жывёлы на пашавае ўтрыманьне і з лепшых зелёных кормаў ся калгаснікаў патрэбна вызначыць пастухоў, а астатніх, слабодных ад работы на фэрме калгаснікаў, перавесьці на іншыя работы, зьвязаныя з фэрмай (кармаздабываньне, будаўніцтва хлявоў, сілосных ям, траншэй і інш.). З наступленьнем стойла вага пэрыяду ўсе гэтыя калгаснікі пераводзяцца на работы па фэрме.

7. За кожнай брыгадай на ўвесь час яе работы на фэрме замацоўваецца -адпаведная група жывёлы, адзін або некалькі скотных двароў і неабходны інвэнтар (жмыхадрабілкі, салямарэзкі, бідоны, падойнікі, інвэнтар для падвозкі корму, вады і інш).

Кожная брыгада нясе поўную адказнасьць за захаваньне, ўпітанасьць і прадукцыйнасьць жывёлы, колькасны і якасны выхад прадукцыі, захаваньне і спраўнае становішча інвэнтару і будынкаў.

8. Катэгарычна забараняецца, як яўна шкодная практыка, работа калгаснікаў на фэрме па чарзе, маючая месца ў паасобных фэрмах.

II. Унутры брыгады чотка разьмяркаваць абавязкі паміж калгаснікамі

Кожны калгасьнік, працуючы на фэрме, павінен яскрава і чотка ведаць свае абавязкі і несьці поўную ад казнасьць за правільнае і своечасовае іх выкананьне.

ЗАГАДЧЫК ФЭРМЫ. На чале кожнайнай фэрмы павінен стаяць загадчык фэрмы. Ён адзіналічна кіруе ўсёй работай на фэрме і нясе асабістую ад казнасьць за арганізацыю і вядзеньне гаспадаркі фэрмы: за выкананьне вытворчага пляну, ўкамплектаваньне стада, забясьпечаньне яго кармамі і памяшканьнямі, здачу (продаж) дзяржаве таварнае прадукцыі. Ён адказвае за правільны дагляд і кармленьне жывёлы, поўнае захоўваньне і правільнае вырасьліваньне маладняку, забясьпечаньне фэрмы быкамі—вытворнікамі, правільнае правядзеньне злучнай кампаніі, своечасовую выбракоўку жывёлы і правядзеньне вэтэрынарна-санітарных мерапрыемстваў па фэрме. Загадчык фэрмы дае нарады брыгадам, устанаўлівае правіла ўнутранага распарадку на фэрме і сочыць за іх выкананьнем, арганізуе вучот жывёлы, кармоў, працы, прадукцыі і інвэнтару па формам Мясамолкалгас цэнтру; вядзе сярод калгаснікаў, працуючых на фэрме, масавую працу па ўнядзеньню сацыялістычных форм працы - соцспаборніцтва, ударніцтва, грамадзкага бюсіра; прадстаўляе к прэміраваньню і высоўваньню лепшых ударнікаў, адказвае за правядзеньне ў жыцьцё пастановы вытворчых нарад, арганізоўвае работу па падвышэньню кваліфікацыі і культурна-палітычнага ўзроўню працуючых на фэрме калгаснікаў праз лекцыі, гутаркі, экскурсіі, выпіску літаратуры, дапамогу сьценгазэце і інш.; арганізоўвае супрацьпажарныя мерапрыемствы па фэрме.

На фэрме, якая абслугоўваецца адной брыгадай, загадчык фэрмы зьяўляецца і брыгадзірам. Загадчык фэрмай назначаецца праўленьнем калгасу тэрмінам на 2 гады і з найбольш актыўных калгаснікаў, маючых вопыт па малочнаму жывёлаводству і зацьвярджаецца канторай Мясамолкалгассаюзу. Зьмена загадчыка да ісьця чэньня 2-х гадовага тэрміну ў выпадках неадпаведнасьці яго можа ўтварацца па асобнаму пастанаўленьню калгасу, ўзгодненаму з райканторай (райупаўнаважаным Мясамолкалгассаюзу.

БРЫГАДЗІР. Кіруе ўсімі работамі на вучастку, замацованым за брыгадай (адзін або некалькі скотных двароў). Ён адказвае за работу ўсёй брыгады: за становішча і прадукцыйнасьць жывёлы, колькасны і якасны выхад прадукцыі, сахраннасьць і спраўнае становішча інвэнтару і інш. Брыгадзір зьяўляецца памоцнікам загадчыка фэрмы і ў выпадку адсутнічаньня апошняга замяшчае яго. Брыгадзір прызначаецца з найбольш актыўных вопытных, аўтарытэтных і адданых справе калгаснага будаўніцтва калгаснікаў-ударнікаў на тэрмін ня менш аднаго году. Прызначэньне і зьмена брыгадзіра ўтвараецца пастановай праўленьня калгасу па прадстаўленьню загадчыка фэрмай. Брыгадзір разьмяркоўвае абавязкі паміж калгаснікаў, прымацоўвае да іх групы жывёлы, папярэдне прапрацаваўшы гэтыя пытаньні на вытворчых нарадах. Пад кіраўніцтвам зоотэхніка, агранома альбо тэхніка-жывёлавода ён складае кармавыя рацыёны, вядзе вучот выдаткаваньня кармоў і падсьцілкі, запісвае ўдоі і прырост жывёлы вагі маладняка, наглядае за злучкамі, ацёламі і ўчытвае іх.

Брыгадзір павінен абавязкова пры сутнічаць пры кармленьні і дойцы кароў, наглядаць за выхаваньнем маладнаку, аказваць першую дапамогу жывёле пры ацёле і захворваньні, у патрэбных выпадках выклікае вэтурача. Брыгадзір атрымоўвае ад загадчыка фэрмай для ўсёй брыгады пляны-нарады на кожны месяц, даводзіць іх да кожнага сябра брыгады і сочыць за выкананьнем работ, даручаных калгаснікам, вядзе вучот колькасьці і якасьці вытвораных работ, ацэньвае працу на аснове ўстаноўленых норм і запісвае працадні ў працкніжкі калгаснікам.

СКОТНІЦА—ДАЯРКА. — На абавязках скотніцы—даяркі ляжыць хаўчаваньне, паеньне, дагляд і частка кароў, выган на прагулку, ўборка кармушак і стойлаў. Даярка—скотніца па вінна трымаць ў чыстаце падойнікі, падмываць вымя ў кароў, даіць, і чысьціць іх. У яе абавязкі ўваходзіць таксама нагляд за цечкай ў кароў і за становішчам іх здароўя. Скотніца—даярка непасрэдна наглядае за ацёлам, абслугоўваемых ёю кароў і нясе ад казнасьць за захаваньне цялят да казнасьць за захаваньне цялят да перадачы яго на вырасьліваньне цялятніцы.

СКОТНІК ПА ДАГЛЯДУ ЗА КАРОВАМІ.—Убірае і вывозіць гной са скотнага двара, падвозіць кармы і падсьцілку, падрыхтоўвае корм да раздачы, ваду для паеньня і іншых патрэб фэрмы, дапамагае скотніцы—даярцы пры раздачы кармоў і паеньні жывёлы, даглядае за быкамі—вытворнікамі, выводзіць іх на прагулку, праводзіць злучку, пераносіць альбо перавозіць цялят з радзільнага памяшканьня ў цялятнік.

Заўвага: Калі на фэрме маецца 5 або больш вытворнікаў, дык для дагляду за імі вызначаецца спэцыяльны скотнік, ў абавязкі якога ўваходзіць і правядзеньне злучкі.

СКОТНІЦА ПА ДАГЛЯДУ ЗА МАЛАДНЯКОМ.— Кормяць, поіць і чысьціць маладняк, падрыхтоўвае корм і ваду, вывозіць гной са скотнага двара, наглядае за становішчам здароўя маладняку і ў выпадку захворваньня неадкладна паведамляе брыгадзіру або загадчыку фэрмай. Пад кіраўніцтвам вэтпэрсаналу аказвае дапамогу захваравўшай жывёле.

ЦЯЛЯТНІЦА.—Кормяць і поіць цялят, чысьціць і абмывае іх, трымае ў чыстаце кармушкі, і спэцыяльную на суду. Выпушчае цялят на прагулку, наглядае за іх здароўем, неадкладна паведамляючы брыгадзіру або загадчыку фэрмай. Пад кіраўніцтвам вэтпэрсаналу аказвае дапамогу захваравўшай жывёле.

ЦЯЛЯТНІЦА.—Кормяць і поіць цялят, чысьціць і абмывае іх, трымае ў чыстаце кармушкі, і спэцыяльную на суду. Выпушчае цялят на прагулку, наглядае за іх здароўем, неадкладна паведамляючы брыгадзіру або загадчыку фэрмай. Пад кіраўніцтвам вэтпэрсаналу аказвае дапамогу захваравўшай жывёле.

ПАСТУХ.—Упашавы пэрыяд пасьпех работы залежыць ў асноўным ад пастуха. Ён абавязан ва ўстаноўлены час выганяць жывёлу на пашу, а так сама заганяць яе ў скотныя двары ці іншым месцы стаянкі. Ён павінен гас падарча скарыстоўваць пасьбішча, па сьвіць жывёлу па вучасткам, паіць жывёлу, у жаркі час заганяць яе ў прахладнае месца. Пастух наглядае за здароўем жывёлы, за цечкай ў кароў і своечасова паведамляе брыгадзіру або загадчыку фэрмай аб зах ворваньні жывёлы, асаблівы нагляд ён павінен весьці за сьцельнымі каровамі, аказаць першую дапамогу пры ацёлах і захворваньнях. У жаркі час ле там пастух павінен арганізаваць начную пасьбу жывёлы. Штодзённа перад выганам на пашу пастух прымае жывёлу, а па звароце з пашы здае яе брыгадзіру.

ВЭТСАНІТАР.—Наглядае за правільным разьмяшчэньнем, кармленьнем і ўтрыманьнем жывёлы. Ён сочыць за тым, каб кармы і вада, якія даюцца жывёле, былі-б добрай якасьці, каб жывёлу своечасова чысьцілі, а таксама трымалі ў чыстаце памяшканьне, вэнтыліравалі іх і добра асьвятлялі. Вэтсанітар даглядае за здароўем жывёлы, аказвае першую дапамогу за жывёлай і ацёлам, лечыць хворых жывотных па ўказаньню вэтпэрсаналу. Асабліва пільна ён павінен наглядаць за сьцельнымі каровамі, за выхаваньнем і становішчам здароўя маладняку, неадкладна аддзяляць хворых жывёл ад здаровых і сачыць за становішчам хворай жывёлы. Арганізацыя на фэрме ізалятара, жывёламагільніка і нагляд за іх санітарным становішчам таксама клопат вэтсанітара. У яго абавязкі ўваходзяць правядзеньне перыядычнай дэзынфэкцыі памяшканьняў, а ў выпадках захворваньня жывёлы заразьлівымі хваробамі, ён павінен неадкладна паведамляць аб гэтым вэтурачу. Вэтсанітар клапоціцца аб набыцьці і папаўненьні вэтаптэчкі, для ліквідацыі вэтсанітарнай пісьменнасьці і падвышэньня кваліфікацыі калгаснікаў вэтсанітар павінен сыстэматычна праводзіць гутаркі з працаўнікамі фэрмы.

ТЭХНІК — ЖЫВЁЛАВОД. — Зьяўляецца тэхнічным кіраўніком вытворчасьці на фэрмах. Ён складае (альбо пад яго кіраўніцтвам складаюцца) гадавыя вытворчыя пляны, гадавыя і месячныя справаздачы, рабочыя праграмы на стойлавы і пашавы пэрыяд і пляны-нарады на кожны месяц для кожнай брыгады. Тэхнік-жывёлавод складае альбо кіруе складаньнем кармавых рацыёнаў для дарослай жывёлы, маладняку і рацыёнаў выпайкі цялят; інструктуе калгаснікаў, як трэба даглядаць, утрымліваць і харчаваць жывёлу. Устанаўлівае час запуску кароў, ўдзельнічае ў камісіях па прыёмцы на фэрме і выбарховуцы жывёлы. Наглядае за здароўем жывёлы і санітарным становішчам скотных двароў, цялятнікаў і іншых памяшканьняў на фэрме. Арганізоўвае падрыхтоўку і кіруе правядзеньнем злучнай кампаніі, ацёлам, падбірае быкоў-вытворнікаў, асаблівую ўвагу кожны тэхнік-жывёлавод павінен ўдзяляць правільнаму вырасьліваньню маладняку. У абавязкі тэхніка-жывёлавода ўваходзіць вядзеньне вытворчага вучоту па фэрмам па формам Мясамолкалгасцэнтру. Ліквідацыя зоотэхнічнай пісьменнасьці калгаснікаў праз арганізацыю гурткоў, гутарак па аўладаньню тэхнікам жывёлаводзтва і інш.

Працяг будзе.

Адказны рэдактар П. ШЭСТАКОЎ.

УВАГА ЛЯГЕРНАМУ ПЭРЫЯДУ РСЧА!

Часьці Чырвонай армії, у тым ліку і Беларуская дывізія, выйшлі ў лягеры.

Лягерны пэрыяд вучобы, самы адказны ва ўсёй сыстэме баявой вучобы часьцей, самы напружаны, калі ад камандзіра і байца патрабуецца максымум вытрымананьсьці і паказу ўсіх сваіх здольнасьцяй.

Лягерныя ўмовы даюць магчымасьць лепш паставіць пасьпяховае вырашэньне складаных пытаньняў па вядзеньні сучаснага бою ў складаных умовах, у бою, калі тэхніка будзе мець вялізарнае значэньне.

Гэта патрабуе ад часьцей ужываньня цяжкіх і складаных форм вучобы—доўгатэрміновыя паходы, пераправы праз рэчкі, начныя «баі» і г. д.

У лягерах павінна быць вырашана заданьне наркому «страляць па меншай меры—добра», што таксама патрабуе значнай увагі, сродкаў і сіл.

Зараз тэрытарыяльныя часьці атрымалі пераменны склад, які ў першы раз прыйшоў у рады армії, а гэта ставіць перад часьцямі пытаньне, каб за кароткі тэрмін іх так вывучыць, каб яны дагналі кадравы склад. Гэта задача вельмі цяжкая.

Перад часьцямі стаіць задача далейшай паглыбленай прапрацоўкі рашэньняў XVII парт. канфэрэнцыі і майскіх пастаноў партыі і ўраду СССР, гэта асабліва датычыцца пераменьніка, які толькі прыйшоў у лягеры. Прапрацоўка гэтых пытаньняў павінна ўзьняць яшчэ на большую вышыню палітычную актыўнасьць байца, яшчэ больш згуртаваць іх вакол партарганізацыі.

Вядома, што складаныя пытаньні міжнароднага становішча СССР, калі пагроза вайны, вайны контрэвалюцыі супроць СССР, значна ўзрасла, павінны быць вядомы кожнаму байцу, вядомы па кантрэтных фактах нашага жыцьця і тых правакацый, якія за апошні час павялічыліся, як вынік жаданьня капіталістычных краін уцягнуць СССР у вайну.

Усе гэтыя пытаньні часьцямі Чырвонай армії могуць быць выкананы пры ўмове, калі на дапамогу часьцям прыйдуць мясцовыя партыйныя, савецкія, прафсаюзныя арганізацыі.

ЗАУСЁДЫ НА ВАРЦЕ!

Вялікая задача стаіць перад пралетарскімі арганізацыямі па ўзмацненьні шэфства. Вопыт мінулага году пака зае, што шэфства ў часткі заводаў паслаблялася, калі часьці пайшлі ў лягеры. Зараз патрэбна вурокі мінулага не паўтараць. Трэба, каб кожнае прадпрыемства заключыла дагавор з вайсковай часьцю, каб гэты дагавор па сац. спаборніцтве правяраўся. Трэба каб рабочыя расказалі калгаснікам і аднаасобнікам, чырвонаармейцам аб сваім змаганьні за выкананьне прамфінпляну, каб паказалі вялізарныя значэньні апошніх рашэньняў партыі і ўраду СССР.

Шэфства ў летні час павінна быць скарыстана і на лепшую пастаноўку ваенізацыі працоўных, бо ўмовы для гэтага ёсьць. Ужо зараз трэба распрацаваць пляны работы арганізацыі Асоавіяхіму, перакліччыца на летнюю работу-выхады, ваенізаваныя паходы, стрэльбы і г. д.

Значную дапамогу часьцям Чырвонай армії павінны даць мясцовыя савецкія органы. Яны, па-першае, павінны павялічыць свае клопаты аб сям'і кадравіка і пераменьніка з тым, каб баец мог займацца вайскова-палітычнай вучобай не азіраючыся назад. Ён павінен ведаць, што яго поле будзе засеяна і ўбрана.

Па-другое, мясцовыя працаўнікі праз выезды ў часьці павінны замацаваць сувязь з часьцю і з пераменьнікамі свайго раёну. Мясцовыя працаўнікі толькі тады атрымаюць добрую дапамогу з боку пераменнага складу і кадравіка, калі тыя самі будуць клапаціцца аб сувязі з імі. Разам з тым, такія выезды ў часьць дадуць лепшы матар'ял для работы з байцом камандна-палітычнаму складу часьцей. Тады работа будзе пабудавана на канкрэтных фактах жыцьця раёну, з якога прыйшоў пераменьнік.

Партыйныя арганізацыі павінны вылучыць сталую колькасьць працаўнікоў для работы ў часьцях у лягерны пэрыяд. Бо часьцям зараз патрэбны кваліфікаваныя працаўнікі, бо палітычная актыўнасьць самога байца значна ўзрасла.

Апрача гэтага, мясцовыя партыйныя камітэты павінны ўзяць на сябе абавязак правядзеньня спэцыяльнай работы з партыйным актывам часьцей РСЧА.

Шэфы Чырвонай армії—арганізацыі, прафсаюзы працаўнікоў мастацтва павінны пашырыць абслугоўваньне ма стацкімі сіламі часьці РСЧА ў лягерах. Гэтых сіл у часьцях не хапае, а патрабаваньне на культурнае абслугоўваньне а боку байца вялікае.

Кааперацыя таксама павінна дапамагчы часьцям. Трэба каб іншыя кааперацыйныя арганізацыі дапамаглі ЗВК абслугоўваць лягеры, з выхадамі, стрэльбамі, начнымі «баямі».

Ад пралетарскай грамадзкасьці залежыць наколькі часьці змогуць заняць па сваёмі непасрэднымі задачамі—вайскова-палітычнай вучобай.

Увага да лягераў з боку пралетарскай грамадзкасьці партыйных, савецкіх і іншых арганізацый і органаў павінна гэтыя ўмовы скласьці.

Магутнасьць Чырвонай армії—адзін з моцных сродкаў правядзеньня палітыкі міру—у выйсьці лягернай вучобы па вінна быць узьнята на новую вышыню.

С. К.

Акадэмічнае выданьне твораў Паўлюка Труса

Творчасьць паэты Паўлюка Труса, дачасна памёршага ўвосень 1929 году, становіць сабой тыповую творчасьць паэты, які прыйшоў у літаратуру з вёскі, але цьвёрда і упэўнена, у працэсе ўпартай барацьбы за сваё сьветавызначэньне, стаў на рэйкі пралетарскай ідэалёгіі. Не дарма на зьезьдзе КП(б)Б тагочасны сакратар ЦК тав. Гамарнік, цытуючы некаторыя радкі паэты, падкрэсьліў, што яны сугучны настроям усёй партыі, усіх працоўных нашай краіны. Паэма «Дзесяты падмурак», уроўне з «Сіраты Алесь», цэлы рад іншых твораў нябожчыка, разам з высока-мастацкім афармленьнем поўнацца бадзёрасьцю, энтузіязмам, поўнацца палкім жаданьнем змаганьня і будаўніцтва.

Таму зусім своячасовым трэба лічыць распачатае Беларускай Акадэміяй Навук акадэмічнае, найбольш поўнае выданьне твораў Паўлюка Труса. 22-га мая ў Доме Пісьменьніка, пад старшынствам тав. Я. Ліманоўскага адбылося паседжаньне інстытуту літаратуры і мастацтва БАН, разам з пісьменьнікамі гор. Менску, прысьвечанае гэтаму пытаньню.

З дакладам аб выданьні твораў паэты выступіў навуковы супрацоўнік інстытуту, прадстаўнік камісіі па акадэмічным выданьні твораў беларускіх пісьменьнікаў тав. Мачульскі. Ахарактарызаваўшы становішча падрыхтоўчай работы, тав. Мачульскі зьвярнуўся да аўдыторыі з просьбаю дасылаць у камісію ўсялякія матар'ялы (недрукаваныя творы, успаміны і г. д.), зьвязаныя з творчай дзейнасьцю Паўлюка Труса.

Камісія мяркуе выдаць творы паэты двума тамамі, прычым у другі том увойдзе ягоная проза («Дзікі сьмех» і інш.), а таксама вершы гумарыстычнага характару, напісаныя ў часе вучобы П. Труса ў менскім Белпэдтэхнікуме.

Праф. М. Піатуховіч зачытаў крытычна-біяграфічны нарыс пра Паўлюка Труса, які пойдзе ў якасьці прадмовы да акадэмічнага выданьня твораў паэты.

Я. Ліманоўскі выступіў з вялікаю прамоваю, спыніўшыся ў ёй на паасобных этапах творчасьці П. Труса і на сваіх спатканьнях з пісьменьнікам.

Вечар, прысьвечаны акадэмічнаму выданьню твораў Паўлюка Труса, скончыўся выступленьнем акад. Замоціна, які падкрэсьліў неабходнасьць камэнтаваньня ў прадмове паасобных вершаў паэты і выступленьнямі таварышоў Багуна і Грышчука.

Трэба спадзявацца, што заклік інстытуту літаратуры і мастацтва БАН па савецкай грамадзкасьці з просьбаю ўсямерна дапамагчы ў выданьні твораў аднаго з выдатнейшых нашых паэтаў перш за ўсё знойдзе водгук сярод блізкіх і знаёмых П. Труса, якія прадставяць камісіі недрукаваныя рэчы ня божчыка, успаміны пра яго і г. д.

Творы Паўлюка Труса павінны нарэшце стаць вядомы найшырэйшым колам рабочых, калгаснікаў, найшырэйшым колам працоўных чытачоў Савецкай Беларусі.

Юр. ЛЯВОНЫ.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ Каса з 1 г. дня	ПАДЗЕІ Ў гор. СЕН-ЛЮІ
КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ Каса ад 12 гадз.	МАЎЧАЦЬ
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ“	ЗДРАДНІК

БЕЛПУШНІНА
даводзіць да ведама, што
РАДЫЁПЕРАДАЧА,
прызначаная на 2-га мая 1932 году,
ПЕРАНОСІЦЦА
на 5-VI 1932 г.,
а 5 з пал. гадзін увечары

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ НА ГАЗЭТНАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ Ў ПАЛІТАСЬВЕТНЫ ТЭХНІКУМ (г. Магілеў, н-Д) на 1932-33 нав год

(АСЕНЬНІ ПРЫЕМ)

1. Газэтнае аддзяленьне палітасьветтэхнікуму ставіць сваёй мэтай падрыхтоўку работнікаў сярэдняга зьвяна раённых газэт жывёлагадоўчых раёнаў (сакратары рэдакцый, загадчыкі сэктароў і іх намесьнікі).

На аддзяленьні існуюць нацыянальныя яўрэйскія і польскія групы, якія рыхтуюць працаўнікоў друку для нацстаронак.

2. На газэтнае аддзяленьне прымаюцца выключна члены і кандыдаты партыі і члены ЛКСМБ, якія маюць камсамольскі стаж ня менш 3-х год і ўзрост—17-30 год.

Пры залічэньні на газэтнае аддзяленьне перавага аддаецца рабочым, удзельнікам грамадзянскай вайны, рабселькорам, ударнікам і работнікам друку.

3. Прыём на газэтнае аддзяленьне вытвараецца, як правіла, па камандыроўках партыйных камітэтаў.

Паступаючыя на газэтнае аддзяленьне павінны падаць на імя раённых і гарадзкіх камісій, што існуюць пры райкомах і гаркомах КП(б)Б, заяву і далучыць паступныя дакументы.

1) аб узросьце, 2) аб адносінах да службы ў Чырвонай армії, 3) аб асьвеце, 4) аб стане здароўя, 5) аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, 6) характарыстыку мясцовай партыйнай або камсамольскай ячэйкі, 7) анкету, засьведчаную савецкімі або прафсаюзнымі ўстановамі ці арганізацыямі раённага маштабу, 8) дзьве фатаграфічныя карткі.

Тэрмін прысылкі дакументаў у тэхнікум (Магілеў, Камсамольская, 28) не пазьней 1 га жніўня.

Увага 1. Дакументы аб асьвеце дасылаюцца толькі ў арыгіналах.

2. Сяляне, некалгаснікі прадстаўляюць копію аклада вога ліста.

3. Форма анкет тая-ж, як і для ўсіх сярэдніх спэцыяльных навуч. устаноў.

4. На газэтнае аддзяленьне тэхнікуму ня прымаюцца асобы з заразнымі хваробамі, хворыя нэўрасьценіяй у клінічнай форме, сухотамі і зусім фізычна слабыя.

5. Паступаючыя на газэтнае аддзяленьне тэхнікуму павінны мець палітычную падрыхтоўку ня ніжэй асноўнай саўпартшколы, здавальняюча арыентавацца ў бягучых палітычных пытаньнях, правільна разумець пастановы партыйных зьездаў і канфэрэнцый, у асаблівасьці XVI зьезду, XVII партканфэрэнцыі, XIII і XIV зьездаў КП(б)Б, апошніх пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, па агульна-адукацыйных прад